Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК і МІНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 213 (6490) | 16 верасня 1939 г., субота | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ У НУМАРЫ:

У Саўнаркоме Саюза ССР і Цэнтральным Камітэце ВКП(б).

Першы дзень прызыва ў Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію і Ваенна-Марскі Флот.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ:

Х. Завелевіч — Калектыўнае кіраўніцтва ў партыйнай рабоце.

П. Кавалёў — Палепшыць работу з маладымі комуністамі.

Падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

А. Цёмкін — Кампанія вялікай дзяржаўнай важнасці.

З. Баравая — Як мы рыхтуемся да выбараў.

С. Саўчанка — Спалучаюць палітычную работу з гаспадарчай.

АРТЫКУЛЫ:

А. Рабіновіч — Неадкладныя задачы мясцовай прамысловасці.

С. Градзоўскі — Беларускі політэхнічны інстытут на ўздыме.

С. Куняўскі — Дарога творчасці.

М. Львоў — Калгасна-саўгасныя тэатры ў новым сезоне.

С. Казначэеў — За першынства ў спаборніцтве.

ЗА РУБЯЖОМ:

Германа-польская вайна.

Распараджэнне Франко.

Ваенныя дзеянні паміж Германіяй і Францыяй.

Сутычка германскага і галандскага самалётаў.

НЕСЦІ Ў МАСЫ БОЛЬШЭВІЦКАЕ СЛОВА

З кожным днём набліжаюцца выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных— кампанія велізарнага палітычнага значэння і размаху. Надыходзіць час, калі многамільённыя масы выбаршчыкаў прыйдуць да выбарчых урн, каб аддаць свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

У радзе абласцей і раёнаў нашай рэспублікі праведзена ўжо значная падрыхтоўка да выбараў. Напрыклад, у Мінскай вобласці ў асноўным закончана арганізацыя выбарчых акруг і ўчасткаў. Намячаецца стварэнне 92 акруг па выбарах у абласны совет, 1.261 акруга па выбарах у раённыя советы і т. д.

Па Мінскай вобласці прадстаіць выбрать каля 9.431 дэпутатаў.

Вялікая работа па разбіўцы раёнаў і гарадоў на выбарчыя акругі і ўчасткі праводзіцца ў Гомельскай вобласці. У такіх гарадах і раёнах, як Рэчыца, Рагачоў, Добруш, Лоеў, Чачэрск, Свяцілавічы, заканчваецца арганізацыя акруг. У вобласці ствараецца 695 акруг па выбарах у раённыя советы, 601 акруга па выбарах у горсоветы і 5.375 выбарчых акруг па выбарах у сельскія советы дэпутатаў працоўных.

Для паспяховага правядзення выбараў трэба ажыццявіць таксама рад іншых арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў. Так, Магілеўскі горсовет ужо закончыў работу па ўдакладненню назваў вуліц, нумарацыі дамоў, праверыў стан выбарчага інвентару і прыступіў да падбору памяшканняў і складання спіскаў выбаршчыкаў. Усе гаралскія, раённыя і сельскія советы павінны правесці гэтыя мерапрыемствы шляхам шырокага прыцягнення совецкага актыва — членаў секцый советаў, дэпутацкіх груп і іншых актывістаў.

Але, зразумела, аднымі арганізацыйнымі мерапрыемствамі не вычэрпваецца падрыхтоўка да выбараў. Выключна вялікае значэнне адыгрывае правільна пастаўленая агітацыйна-масавая работа сярод насельніцтва па раз'ясненню выбарчага закона і важнейшых палітычных падзей у нашай краіне і за мяжой.

Рад партарганізацый добра разгарнуў масава-палітычную агітацыю. На многіх прадпрыемствах, ва ўстановах і ў калгасах нашай рэспублікі праводзяцца цяпер сходы, на якіх абмяркоўваюцца вынікі ўнечарговай Чацвертай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР. Працоўныя масы з велізарным уздымам сустракаюць гістарычныя рашэнні Сесіі, горача адабраюць прынятыя Сесіяй законы, накіраваныя на далейшы росквіт і ўмацаванне магутнасці нашай социялістычнай радзімы.

«Пачуцці вялікай гордасці за нашу радзіму выклікаюць у нас даклады таварыша Молатава і Варашылава, — пішуць у сваёй рэзалюцыі рабочыя мінскага завода імені Варашылава. — Мы гардзімся вялікай краінай социялізма, партыяй большэвікоў і любімым таварышам Сталіным». Варашылаўцы ўзялі на сябе абавязацельства яшчэ больш разгарнуць социялістычнае спаборніцтва і стахانаўскі рух і дабіцца датэрміновага выканання вераснёўскай праграмы.

Калгасныя масы аднадушна адабраюць ленінска-сталінскую знешнюю палітыку совецкага ўрада і мудрыя сталінскія законы, прынятыя Сесіяй. Закон аб сельскагаспадарчым падатку поўнасцю адпавядае як інтарэсам нашай социялістычнай дзяржавы, так і інтарэсам калгасных мас. Гэты закон павышае зацікаўленасць калгаснікаў у паляпшэнні работы калгасаў і павелічэнні даходнасці грамадскай гаспадаркі і, такім чынам, садзейнічае далейшаму ўмацаванню калгаснага ладу.

Найярчэйшай дэманстрацыяй аднадушнага адабрэння ўсім совецкім народам і моладдзю новага закона аб усеагульным воінскім абавязку, прынятага Сесіяй, з'яўляецца сёлетні прызыў у Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію і Ваенна-Марскі Флот. Дзень прызыва ператварыўся ў сапраўднае ўсенароднае свята. Прызыў у Чырвоную Армію наша выдатная совецкая моладзь успрымае, як здзейсненне сваіх самых дарагіх, заветных мар. Маладыя патрыёты поўны гордасці і ўдзячнасці нашаму ўраду, партыі, вялікаму Сталіну, якія даверылі ім самую пачэсную для грамадзян СССР справу — са зброяй у руках абараняць социялістычную радзіму.

Важнейшай задачай партыйных арганізацый з'яўляецца раз'яснение ўсяму насельніцтву рашэнняў унечарговай Чацвертай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР і палажэння аб выбарах у мясцовыя Советы. У многіх арганізацыях ужо вылучаны і зацверджаны агітатары, створаны гурткі па вывучэнню выбарчага закона. Напрыклад, па адной толькі Магілеўскай вобласці арганізавана 9.826 гурткоў, якія ахватваюць 166.131 чалавека.

Але агітацыйна-масавая работа ў радзе арганізацый яшчэ не адпавядае ўзросшым патрабаванням шырокіх мас працоўных. Не ўсюды наладжана сістэматычная штодзённая работа сярод насельніцтва на выбарчых участках. Сходы і гутаркі, чытка газет па ўчастках адбываюцца даволі рэдка. Так, у радзе сельсоветаў Глускага раёна слаба праводзіцца палітычна-масавая работа. У Дакольскім сельсавеце гэтага раёна вылучана 33 агітатары, але ні адзін з іх не прыступіў да раз'яснення выбарчага закона. Да апошніх дзён Мінскі сельскі райком партыі яшчэ не падабраў 200 агітатараў, і, як вынік гэтага, у радзе калгасаў раёна не распачата масава-раз'яснёцельная работа сярод насельніцтва.

Лепшыя агітатары арганізавалі сістэматычныя сустрэчы з выбаршчыкамі. Побач з раз'ясненнем выбарчага закона, яны асвятляюць важнейшыя палітычныя падзеі ў нашай краіне і за граніцай. Вось, напрыклад, агітатар тав. С. Н. Ішчук — галоўны бухгалтар Крычаўскага цэментнага завода. У строга вызначаныя дні і гадзіны ён праводзіць заняткі ў гуртку, які складаецца з 16 слухачоў — жанак рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў завода, пражываючых у доме № 8. Гуткі тав. Ішчука цікавыя і змястоўныя, у іх з задавальненнем прымаюць удзел усе слухачы.

Агітатар—калгасніца Анна Канцэвая ў гуртку пры калгасе «Чырвоны ударнік», Лёзнянскага раёна, апрача вывучэння выбарчага закона сістэматычна знаёміць калгаснікаў і калгасніц з міжнародным становішчам і важнейшымі пытаннямі жыцця нашай краіны. Заняткі гуртка праходзяць цікава і змястоўна. Агітатар Канцэвая прыходзіць таксама ў дамы калгаснікаў і гутарыць з кожным у пасобку аб надыходзячых выбарах.

Партыйным арганізацыям неабходна так арганізаваць работу з агітатарамі, каб яны маглі адказваць на ўсе пытанні, з якімі да іх звяртаюцца выбаршчыкі. Нашы агітатары павінны даваць вычарпальныя адказы на пытанні аб рашэннях, прынятых унечарговай Чацвертай Сесіяй Вярхоўнага Совета СССР, умела раз'яснець важнейшыя міжнародныя падзеі. Трэба ўлічыць, што да ўсіх гэтых пытанняў наша насельніцтва праяўляе зараз велізарную цікавасць.

Важна таксама раз'яснць насельніцтву тыя меры, якія прымае наш совецкі ўрад па далейшаму ўмацаванню абароназдольнасці нашай краіны, і задачы, якія стаяць у сувязі з гэтым перад працоўнымі. Агітатар, расказваючы аб гістарычных рашэннях закончыўшайся ўнечарговай Чацвертай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР, павінен давесці да сазнання мас велізарнае значэнне гэтых рашэнняў, падмацаваных «цвёрдай упэўненасцю ў нашых рэальных сілах, у іх поўнай гатоўнасці на вышалак любой агрэсіі супроць СССР» (Молатаў).

Сярод бушуючых хваляў вайны ў Еўропе толькі адна краіна — СССР — спакойна і ўпэўнена прадаўжае творчую работу па социялістычнаму будаўніцтву, мацуе сваю абароназдольнасць, «каб ніякая «выпалкованасць» і ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не маглі засігнуць нас знянацку» (Сталін). Совецкі ўрад — самы моцны ў свеце, бо ён абапіраецца на маральна-палітычнае адзінства і маналітнасць 170-мільённага совецкага народа.

Партыйныя арганізацыі павінны наладзіць аператыўнае кіраўніцтва ўсёй агітацыйнай работай сярод насельніцтва, як у горадзе, так і на сяле, вылучаць лепшых, найбольш палітычна падрыхтаваных і правераных работнікаў для вядзення масава-палітычнай агітацыі і штодзённа правяраць іх работу. Масава-палітычную агітацыю сярод насельніцтва трэба паставіць у цэнтр увагі ўсіх нашых партыйных арганізацый.

СОВЕЦКА-ЯПОНСКАЕ ПАГАДНЕННЕ З ПОВАДУ КАНФЛІКТА НА МАНГОЛА-МАЧЖУРСКАЙ ГРАНІЦЫ

У рэзультаце адбываўшыхся ў апошнія дні перагавораў паміж японскім паслом п. Того і Народным Камісарам Замежных Спраў т. Молатавым, абедзве стораны, г. зн. японска-манчжоугоская і совецка-мангольская, прышлі да наступнага пагаднення:

1. Японска-манчжоугоскія войскі і совецка-мангольскія войскі спыняюць 16 верасня ў 2 гадзіны па маскоўскаму часу ўсякія ваенныя дзеянні.

2. Японска-манчжоугоскія войскі і совецка-мангольскія войскі астаюцца на займаемых імі 15 верасня ў 13 гадзін па маскоўскаму часу лініях.

3. Прадстаўнікі войск абодвух старон на месцы неадкладна прыступаюць да выканання п.п. 1 і 2 данага пагаднення.

4. Палонныя і трупы абодвух старон падлягаюць абмену, аб чым прадстаўнікі войск абодвух старон на месцы неадкладна дагаварваюцца паміж сабой і прыступаюць да выканання.

Апрача таго, у перагаворах паміж п. Того і т. Молатавым дасягнута пагадненне аб тым, што ў мэтах удакладнення граніцы паміж Мангольскай Народнай Рэспублікі і Манчжоу-го ў раёне нядаўняга канфлікта будзе арганізавана магчымая хутчэй камісія з двух прадстаўнікоў совецка-мангольскай страны і двух прадстаўнікоў японска-манчжоугоскай страны. Камісія прыступіць да сваёй работы зараз-жа па яе ўтварэнні. (ТАСС).

Нарушэнне граніцы германскім самалётам

15 верасня над горадам Олеўск (Украіна) паявіўся невядомы самалёт. Абстрэлены кулямётным агнём нашых войск, самалёт вымушан быў зрабіць пасадку ля сяляння Лугіно. Самалёт аказаўся нямецкім двухматорным бамбардыроўшчыкам, экіпаж яго ў саставе 5 чалавек накіраван у Кіеў, а самалёт узят пад ахову. (ТАСС).

Першы дзень прызыва ў Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію і Ваенна-Марскі Флот

МАЛАДЫЯ ПАТРЫЁТЫ З ВЯЛІКІМ НАТХНЕННЕМ ІДУЦЬ У ЧЫРВОНУЮ АРМІЮ

* * *

ПАТРЫЁТЫ

МАГІЛЕЎ, 15 верасня. (Спец. кар. «Звязды»). Горад упрыгожан партрэтамі правадыроў партыі і ўрада, лозунгамі. На святочна ўбраных вуліцах праходзіць з песнямі бадзёрая моладзь. Гэта прызыўнікі. Яны спяшаюцца на прызыўны пункт.

8 гадзін раніцы. На прызыўным пункце, які размешчан у выдатным памяшканні клуба шоўкавай фабрыкі імені Куйбышэва, поўна моладзі. Адбыўся мітынг. Урачы, члены камісіі разышліся па сваіх кабінетах. У першы дзень прызываецца моладзь шоўкавай фабрыкі імені Куйбышэва.

Першым быў выклікан тав. Н. Валчок— лепшы стахانавец фабрыкі. Малады патрыёт залічан у інжынерна-тэхнічнае вучылішча.

— Мая мара—паступіць у інжынерна-тэхнічнае вучылішча,—заяўляе Валчок,—збылася. На фабрыцы я быў лепшым стахانаўцам-прадзільшчыкам. Выдатнікам буду і ў РСЧА. Буду вучыцца так, каб з чэсцю апраўдаць высокае званне чырвонага воіна.

Прызыўнікі тт. Д. Страпганка і Г. Гальперын залічаны ў артылерыйскае вучылішча, тав. І. Белахвостаў—у аўтамехчасць.

З самай раніцы прышоў на прызыўны пункт машыніст шоўкавай фабрыкі Аляксандр Паўлоўскі. Ён па свайму узросту павінен прызывацца ў 1940 годзе. Але Паўлоўскі жадае пайсці ў армію сёлета.

— Улічваючы міжнародную абстаноўку, прашу прызыўную камісію залічыць мяне ў РСЧА датэрмінова. Буду да канца адданы сваёй радзіме,—піша ў сваёй заяве тав. Паўлоўскі.

Шчаслівай прышла на прызыўны пункт работніца фабрыкі Мар'я Прыгарына. Ёй 50 год.

— Я даведалася, што сына майго Владзіміра прынялі ў армію,—расказвае Марыя.—А таму я прышла сюды, каб даць наказ сыну:—глядзі, сынок, ахоўвай нашу радзіму, службы чесна!

Толькі тав. Прыгарына выказала гэтыя словы, як раскрываюцца дзверы і запыхаўшыся ўбягае на пункт яе другі сын Георгій. Ён 1921 года нараджэння, вучыцца ў 9 класе.

— Мама, хвалюючыся заяўляе Георгій.—Я прышоў прасіць прызыўную камісію прыняць мяне ў Чырвоную Армію датэрмінова і накіраваць у танкавае вучылішча. Хачу стаць танкістам.

Маці ветліва паглядзела на сына і сказала: «Вельмі добра, сынок».

Першы дзень прызыва паказаў, што сёлета ў Чырвоную Армію ідзе выдатнае папаўненне. Большасць маладых патрыётаў—комуністы і комсамольцы, значная колькасць—стахانаўцы, значкісты. Здароўе ў кожнага прызыўніка выдатнае.

Ф. РУЦКІ.

НАРОДНАЕ СВЯТА

БАБРУЙСК, 15 верасня. Як вялікае ўсенароднае свята, сустрэлі працоўныя горада першы дзень прызыва ў Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію і Ваенна-Марскі Флот. На вуліцах вывешаны чырвоныя сцягі. Прызыўны пункт прыгожа аформлен партрэтамі кіраўнікоў партыі і ўрада, лозунгамі. Над уваходам красуецца вялікі транспарант са словамі гарачага прывітання прызыўнікам.

Стройнай калонай, са сцягамі, букетамі кветак, пад музыку духавога аркестра прышлі на прызыўны пункт маладыя патрыёты дрэваапрацоўчага камбіната, заяваўшыя пачэснае права першымі прызывацца. На мітынгу, прысвечаным пачатку прызыва, выступіў малады стахانавец лесапэха комсамолец тав. Сокалаў. Ён гаворыць:

— З найвялікшай радасцю мы ідзем у рады любімай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Пад кіраўніцтвам армейскіх большэвікоў-камандзіраў і палітработнікаў мы выдатна вывучым ваенную справу, станем выдатнікамі баявой і палітычнай вучобы. Я запэўняю вас, таварышы, што з чэсцю апраўдаю высокае званне воіна магутнейшай арміі ў свеце.

Ля стала прызыўной камісіі стахانавец тав. Баравік. На пытанне старшыні прызыўной камісіі ён адказвае, што з радасцю гатоў ісці служыць у любую часць.

Тав. Баравіку абвяшчаюць, што ён залічан у артылерыйскую часць.

Стахانавец-рамнчык лесапэха № 1 комсамолец тав. Баспяровіч даўно марыў стаць лётчыкам. Ён добра падрыхтаваўся да прызыва, здаў нормы на 3 абаронныя значкі. Прызыўная камісія задавальняе яго просьбу, залічвае ў Н-скую авіячасць.

Да стала камісіі бесперапынна падыходзяць мужныя, жыццерадасныя юнакі, гатовыя з чэсцю несці пачэснае званне воіна Чырвонай Арміі.

АСТАНУСЯ Ў АРМІІ ПАЖЫЦЦЁВА

Нарэшце, доўгачаканы дзень надышоў. Я іду прызывацца ў Чырвоную Армію. Маё сэрца напоўнена вялікай радасцю.

Разам са мной ідуць служыць нашай любімай радзіме звыш 150 маладых рабочых нашай віцебскай швейнай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі».

Рыхтуючыся да знамянальнага дня, прызыўнікі нашай фабрыкі ўпорна вывучалі ваенную справу ў абаронных гуртках, і зараз няма ні аднаго, які-бы не меў па некалькі абаронных значкоў. Я асабіста маю 4 значкі: ПВХА, варашылаўская стралка, ГПА і ГСА.

Я горача люблю родную Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію і даў сабе слова астацца ў ёй пажыццёва.

Буду прасіць прызыўную камісію залічыць мяне ў бронетанкавую часць.

А. Н. ВІХЛЯЕЎ,
механік віцебскай швейнай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі».



У дзень прызыва ў рады РСЧА 15 верасня на прызыўны пункт Сталінскага райваенкамата горада Мінска прышоў стахانавец-электраманцёр млына імені Дзержынскага (г. Мінск) комсамолец Яўген Максімаў. Яго маці Аляксандра Цімафееўна звярнулася ў ваенкамат з просьбай аб залічэнні яе сына ў рады Ваенна-Марскога Флота, матывіруючы сваю просьбу тым, што яна жадае, каб усе яе чатыры сыны служылі ў РСЧА. Яе тры старшыя сыны ўжо служаць у радах РСЧА: Барыс — капітан у часцях сувязі, Анатолій — авіятэхнік, Юрый — танкіст. Просьба маціры аб залічэнні яе чацвертага сына Яўгена ў Ваенна-Марскі Флот задаволена: ён залічан у Ваенна-Марскі Флот. НА ЗДЫМКУ: Яўген Максімаў. Фото В. С. Баранава (фотахроніка БЕЛТА).

АДМАЎЛЯЮЦЦА АД ІЛЬГОТ

ВІЦЕБСК, 15 верасня. (По тэлефону). Сёння ў трох раёнах Віцебскай вобласці пачаўся прызыў у рады слаўнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

У святочна ўпрыгожанае памяшканне суражскага прызыўнога пункта прышлі маладыя совецкія патрыёты. Першым прадстаў перад прызыўной камісіяй памочнік дырэктара Задвінскай МТС тав. Кубліцкі. Ён добра падрыхтаваўся да прызыва, мае чатыры абаронныя значкі. Камісія задаволіла яго просьбу аб залічэнні ў бронетанкавую часць. Трактарыст гэтай-жа МТС тав. Несперай быў вельмі рад, калі камісія прызнала яго стан здароўя выдатным і таксама накіравала ў бронетанкавую часць.

З радасцю сустрэлі паведамленне камісіі аб залічэнні на службу ў Ваенна-Марскі Флот прызыўнікі тт. Навіцкі і Касенка.

Прызыў праходзіць ва ўмовах высокага патрыятычнага ўздыму. 10 прызыўнікаў-калгаснікаў падалі заявы, што яны адмаўляюцца ад прадстаўляемых ім па закону ільгот.

Са сцягамі і партрэтамі кіраўнікоў партыі і ўрада прышлі на пункт прызыўнікі раённага цэнтра Лёзна. Тут адбыўся мітынг будучых чырвоных байцоў. Ад імені партыйных і совецкіх арганізацый раёна прызыўнікаў вітаў тав. Каманзіенка.

У Соўнаркоме Саюза ССР і Цэнтральным камітэце ВКП(б)

I.

АБ ХОДЗЕ ВЫКАНАННЯ ПАСТАНОВЫ СНК СССР І ЦК ВКП(б) «АБ МЕРАПРЫЕМСТВАХ ПА РАЗВІЦЦЮ ГРАМАДСКАЙ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ У КАЛГАСАХ»

Абмеркаваўшы пытанне аб ходзе выканання пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб мерапрыемствах па развіццю грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах», Соўнарком Саюза ССР і ЦК ВКП(б) **пастанавілі:**

1. Звярнуць увагу соўнаркомаў саюзных і аўтаномных рэспублік, краявых і абласных выканкомаў, ЦК компартый саюзных рэспублік, райкомаў і абкомаў ВКП(б) на тое, што верасень і кастрычнік з'яўляюцца рашаючымі месяцамі ў справе камплектавання пагалоўем жывёлы калгасных жывёлагадоўчых ферм. Рэкамендаваць калгасам па працяту гэтага часу набыць у калгаснікаў і не членаў калгасаў, а таксама ў соўгасах і іншых арганізацыях неабходную колькасць маладняка і дарослай жывёлы з тым, каб забяспечыць арганізацыю ферм у тых калгасах, дзе іх не было, а таксама ўкамплектаванне пагалоўем усіх ферм у колькасцях, устаноўленых для 1940 года.

2. Улічваючы, што замена мяса зярном пры выкананні калгасамі абавязковых паставак мяса дзяржаве будзе дапускацца толькі ў выключных выпадках з дазволу Наркамзага СССР, абавязаць мясцовыя совецкія і партыйныя арганізацыі, побач з выкананнем плана камплектавання ферм, забяспечыць пастаноўку калгасамі на адкорм жывёлы ў колькасцях, дастатковых для выканання плана паставак мяса ў 1940 годзе, асабліва ў першым і другім кварталах, пры гэтым не дапускаючы скарачэння матачнага пагалоўя ў жывёлагадоўчых фермах.

3. Прапанаваць мясцовым совецкім і партыйным арганізацыям рашуча пакончыць з пагардлівымі адносінамі да забеспячэння грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах грубымі, сочнымі і канцэнтрыраванымі кармамі і жывёлагадоўчымі будынкамі, маючы на ўвазе, што зімоўка жывёлы ў 1939—1940 гг. будзе рашаючай у справе далейшага развіцця і ўмацавання грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах.

II.

АБ ПАЛЯВЫМ КАГАТЫРАВАННІ ЦУКРОВЫХ БУРАКОЎ У КАЛГАСАХ

Абмеркаваўшы пытанне аб палявым кагатыраванні цукровых буракоў у калгасах УССР, Соўнарком Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) адзначылі, што ў абласцях пасеву буракоў за апошнія гады дасягнуты значныя поспехі: павысілася ўраджайнасць цукровых буракоў, узрасла прадукцыйнасць цукровых заводаў, а таксама зменшыліся страты цукру ў вытворчасці.

Побач з гэтым, СНК СССР і ЦК ВКП(б) устанавілі, што хаванне цукровых буракоў у калгасах у дробных палявых кучах і на прыёмачных пунктах цукровых заводаў мае многа недахопаў, у рэзультаце чаго штогод краіна недаатрымлівае велізарнай колькасці цукру, а ў калгасах знікаюцца даходы ад цукровых буракоў і змяншаецца кошт працадня.

Існуючая практыка палявога хавання цукровых буракоў у невялікіх кучах прыводзіць да значнага псавання буракоў і страты цукру, ускладняе далейшае хаванне іх у заводскіх кагатах, пагаршае працэс вытворчасці і прыводзіць да зніжэння выхаду цукру.

Хаванне цукровых буракоў у невялікіх кучах патрабуе вялікай канцэнтрацыі транспартных сродкаў у раёнах пасеву буракоў на невялікі перыяд часу, тармозіць механізацыю пагрузкі буракоў пры транспартыроўцы, што зніжае прадукцыйнасць транспарта, а таксама прыводзіць да нясвоечасовага аслабнення поля для правядзення асенніх работ, у выніку чаго зніжаецца ўраджай зернавых культур і ствараюцца спрыяючыя ўмовы для развіцця хвароб і шкоднікаў цукровых буракоў.

У мэтах палянпшэння справы хавання і пераапрацоўкі цукровых буракоў, правільнага скарыстання транспартных сродкаў і памяншэння грузанапружанасці ў бураковых раёнах у перыяд верасень—кастрычнік месяцы, — СНК СССР і ЦК ВКП(б) **пастанавілі:**

1. Абавязаць СНК УССР, аблвыканкомы абласцей пасеву буракоў у часе ўборкі буракоў гэтага года арганізаваць у калгасах палявое кагатыраванне цукровых буракоў.

2. Даручыць Наркамхарчпрому СССР сумесна з СНК УССР, РСФСР, Казахскай ССР, Кіргізскай ССР, Грузінскай ССР устанавіць аб'ём палявога кагатыравання цукровых буракоў у 1939 годзе па абласцях у памерах не больш 12 проц. агульнага валавога збору па СССР.

Абавязаць аблвыканкомы не пазней 20 верасня 1939 года давесці заданні па палявому кагатыраванню да раёнаў пасеву буракоў і калгасаў з улікам неабходнасці бесперабойнай работы кожнага завода і забяспечанасці транспартам раёнаў і калгасаў.

3. Абавязаць райвыканкомы, дырэктараў МТС, цукровых заводаў і праўленні калгасаў пры палявым кагатыраванні цукровых буракоў строга прытрымлівацца наступных палажэнняў:

а) буракі вераснёўскай копкі ўкладваюцца ў палявыя кучы, вывозяцца на бурачныя пункты заводаў услед за копкай і палявому кагатыраванню для працягнага хавання не належаць;

б) буракі кастрычніцкай копкі кагатыраванню належаць у межах устаноўленага плана. Астатнія буракі складваюцца ў палявыя кучы і вывозяцца непасрэдна на пункты загатоўкі буракоў цукровых заводаў;

в) у палявыя кагаты павінны паступаць буракі непасрэдна пасля ачысткі і сартыроўкі — здаровыя, непашкоджаныя і непрыяленыя;

г) у мэтах забеспячэння бесперабойнай вывазкі цукровых буракоў на працягу ўсяго перыяда хавання, палявыя кагаты размяшчаць ля магістральных дарог;

д) пры ўстанаўленні пунктаў кагатыравання і зон іх размяшчэння выходзіць з неабходнасці бесперапыннага снабжэння цукровых заводаў буракамі і найбольш рацыянальнага скарыстоўвання транспартных сродкаў. Для гэтага не дапускаць палявога кагатыравання цукровых буракоў у калгасах у радыусе да 8 кілометраў ад прыёмачных пунктаў; у калгасах-жа, размешчаных у радыусе больш 14—16 кілометраў, аб'ём кагатыравання вызначыць у залежнасці ад месца размяшчэння калгаса, наяўнасці транспартных сродкаў і становішча дарог.

4. Наркамзему і Наркамхарчпрому СССР у 3-дзенны тэрмін распрацаваць і давесці да раёнаў пасеву буракоў і калгасаў інструкцыю па палявому кагатыраванню цукровых буракоў у 1939 г.

5. Арганізацыю палявога хавання цукровых буракоў у калгасах і адказнасць за хаванне ўскласці на праўленні калгасаў, а кантроль і кіраўніцтва пры правядзенні палявога кагатыравання ўскласці на абземупраўленні, райземаддзелы, МТС і цукровыя заводы.

6. Абавязаць аблвыканкомы, райвыканкомы, дырэктараў МТС, цукровых заводаў і старшынь калгасаў забяспечыць падрыхтоўку неабходнай колькасці кадраў для палявога кагатыравання буракоў. Праўленням калгасаў забяспечыць своечасовую загатоўку мат і іншых матэрыялаў і інвентару, неабходнага для палявога хавання буракоў, а дырэктарам заводаў забяспечыць калгасы кагатнымі тэрмометрамі і вапнай.

7. Пры дастаўцы буракоў з палявых кагатаў на чыгуначныя пункты не дапускаць паўгорнага кагатыравання, для чаго абавязаць заводы прадугледзець па калгасах адпаведныя разнарадкі па вывазцы буракоў на кожны дзень.

8. Абавязаць Наркамхарчпром СССР правесці 15-дзенныя курсы пры цукровых заводах для кагатчыкаў па хаванню буракоў у палявых кагатах, для чаго Наркамхарчпрому СССР вылучыць 500 тысяч рублёў са сродкаў па загатоўцы і хаванню буракоў.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

КАЛЕКТЫЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА Ў ПАРТЫЙНАЙ РАБОЦЕ

Паспяховае выкананне гаспадарчых і палітычных задач ва многім залежыць ад узгодненасці ў кіраўніцтве, ад «быстрага вырашчвання і выхавання членаў партыі ў духу калектыўнага кіраўніцтва».

Выходзячы з гэтых прынцыпаў, бюро партарганізацыі вагонарамонтнага завода імені Мяснікова ў сваёй практычнай рабоце ажыццяўляе калектыўнае кіраўніцтва. Кожнае пытанне члены бюро рашаюць сумесна. Ва ўсёй сваёй рабоце партбюро заўсёды апіраецца на заводскі партыйны актыў. І гэта дае нам магчымасць быць у курсе ўсяго, што робіцца на вытворчасці.

Кожны член бюро адказвае за канкрэтны ўчастак работы. Так, член партбюро, начальнік вагоназборачнага цэха т. Райко цесна звязан з комсамольскай арганізацыяй. Ён прысутнічае на комсамольскіх сходах, дае практычныя ўказанні. Дапамагае тав. Райко і мне ў кіраўніцтве заводскім агіткалектывам. Па даручэнню бюро ён не раз праводзіў парады агітатараў. Працуе з кожным агітатарам паасобку, дае парады, як лепш вырашыць тое ці іншае пытанне.

Малады кандыдат партыі т. Пятроўскі—начальнік комплекснай брыгады—не меў дастатковага вопыту агітацыйнай работы. Яму дапамог тав. Райко. Указаў на прабелы ў рабоце і зараз тав. Пятроўскі лічыцца адным з лепшых агітатараў вагоназборачнага цэха.

Другі член партбюро т. Карнейка нядаўна правёў нараду комуністаў, самастойна вывучаючых гісторыю ВКП(б), па абмену вопытам работы над кнігай.

Член бюро т. Самуйлаў—палітінфарматар. Ён, падрыхтоўваючы да партсхода тое ці іншае пытанне, прыцягвае да работы радавых комуністаў. Напрыклад, калі падрыхтоўвалася пытанне аб авангардной ролі комуністаў на вытворчасці, разам з т. Самуйлавым працавала 8 чал. Тав. Лаваръй вывучыў пытанне аб партыйнай дысцыпліне, т. П. Біруля —аб ролі комуністаў у барацьбе за высокую якасць рамонту вагонаў, т. Манасевіч пазнаёміўся з тым, як члены партыі ўдзельнічаюць у абароннай рабоце.

Дзякуючы такой падрыхтоўцы, партыйны сход прайшоў вельмі актыўна і на высокім палітычным узроўні. З прысутных на сходзе 52 комуністаў у спрэчках выступіла 18, усе выступленні насілі канкрэтны, дзелавы характар.

Вялікае значэнне мае прыцягненне актыва і радавых комуністаў да складання плана работы партбюро і ажыццяўлення гэтага плана.

У нас план партбюро складаецца на месяц. У канцы месяца праводзім гутаркі з комуністамі, членамі бюро, камандзірамі вытворчасці аб тым, якія пытанні падняць у наступным месяцы. Такім чынам выплывае рад канкрэтных тэм, якія пасля ўключаюцца ў план работы партбюро.

Апіраючыся на шырокі актыў комуністаў, бюро партарганізацыі своечасова выяўляе недахопы на вытворчасці. Так аказалася, што з-за асобных непаладак і неарганізаванасці зрывалася выкананне вытворчага плана ў вагоназборачным цэху, якасць прадукцыі была нізкай, асабліва па рамонту хадавых часцей. Становішча работы ў цэху абмяркоўвалі на пасяджэнні бюро. Праз некаторы час праверылі работу цэха, аказалася, што справа не палепшылася. Тады па ініцыятыве партбюро было ў другі раз зроблена дэтальнае абследванне цэха; комуністы, якія прынялі ўдзел у абследванні, не толькі ўскрылі прычыны адставання, але і ўнеслі свае прапановы па ўдасканаленню тэхналагічнага працэса. Прынятае бюро рашэнне было даведзена да ведама камандзнага састава і рабочых. Яно ўзняло вытворчую актыўнасць, і, як вынік, цэх вышаў у рады перадавых і заваяваў пераходны чырвоны сцяг завода.

Калектыўнасць у рабоце актывізіруе кожнага члена партыі. Мы дабіліся таго, што комуністы прыходзяць у партбюро і сігналізуюць аб непаладках у цэхах. Напрыклад, па сігналу члена партыі т. Бандарэнка абмеркавалі пытанне аб рабоце кавальскага цэха.

Мы паставілі сваёй задачай—яшчэ глыбей уваходзіць ва ўсе дэталі вытворчасці, яшчэ больш умацоўваць сувязь з беспартыйным актывам і інтэлігенцыяй. Партарганізацыя ва 1939 год прыняла ў свае рады 26 стаханаўцаў і перадавой інтэлігенцыі завода. Зараз у нашай партарганізацыі налічваецца 50 членаў партыі і 22 кандыдаты.

Мабілізаваўшы ўвесь калектыў завода на выкананне вытворчых заданняў, мы дабіліся таго, што завод штомесяц выконвае план рамонту вагонаў. Прадукцыйнасць працы павысілася на 12 процантаў.

Калектыўнасць у партыйным кіраўніцтве выхоўвае ў комуністаў пачуццё адказнасці за даручаную справу. Гэта значна паляпшае работу партыйнай арганізацыі ў барацьбе за выкананне гістарычных рашэнняў XVIII з'езда ВКП(б).

Х. З. ЗАВЕЛЕВІЧ,
сакратар партбюро мінскага вагонарамонтнага завода імені Мяснікова.

Дырэктар Беларускага інстытута пералівання крыві, член партыі І. М. Стэльмашонак за вывучэннем 8-га раздзелу «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».
Фото В. Марцыёнка (Фотахроніка БЕЛТА).

ПАЛЕПШЫЦЬ РАБОТУ З МАЛАДЫМІ КОМУНІСТАМІ

Днямі пры Чачэрскім райкоме КП(б)В адбылася нарада кандыдатаў у члены партыі. На парадку дня стаяла пытанне аб рабоце сярод кандыдатаў. Нарада была дрэнна падрыхтавана. Кандыдаты даведаліся аб ёй у апошнія мінуты, таму і не дзіва, што ў спрэчках выступіла ўсяго толькі пяць чалавек.

Ні адзін з выступіўшых не падвяргаў рэзкай крытыцы райком партыі за яго адарванасць і дрэннае кіраўніцтва маладымі комуністамі. Напрыклад, у радзе пярвічных партыйных арганізацый—Нова-Зарачанскай, Нова-Малыніцкай і іншых—комуністы не працуюць над павышэннем свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню, не вывучаюць слаўных традыцый барацьбы і перамог большэвіцкай партыі.

Райком КП(б)Б мала працуе з кандыдатамі, не раз'ясняе членам партыі, парадак дачы рэкамендацый. У выніку многія знаходзяцца ў кандыдатах па пяць і больш год. Сярод іх: загадчык райана Пракопенка, Г. Мельнікава (Рудня-Барталамееўскі сельсавет), Васільеў і Ільінскі (партарганізацыя калгаса імені Варашылава, Роўкавіцкага сельсавета) і інш.

Вось што расказаў на нарадзе кандыдат партыі тав. Акінчыц Аляксандр з калгаса імені Кірава, Навухавіцкага сельсавета:

— Не раз,—гаворыць ён,—я звяртаўся да члена партыі тав. Маржава (загадчык райза) за рэкамендацыяй. Апошні не адмовіў, абяцаў напісаць. Прайшоў год, абяцанай рэкамендацыі не атрымаў. Між тым Маркаў ведае мяне з дзяцінства.

Гэта не адзінкавы выпадак. Больш года ходзіць кандыдат партыі тав. Кражава за рэкамендацыяй да члена партыі Гатальскага і атрымлівае адны абяцанні.

Выхаванне маладых комуністаў павінна заняць адно з галоўных месц у рабоце райкома партыі, пярвічных партыйных арганізацый. Між тым у Чачэрску закінулі гэту важнейшую справу.

П. КАВАЛЁЎ.

КАНДЫДАЦКАЯ ГРУПА КАМЕНСКАГА ІЛЬНОЗАВОДА

Кандыдацкая партыйная група пры Каменскім ільнозаводзе Лепельскага раёна арганізавалася нядаўна—4 з палавінай месяца таму назад. Яна ведае 2 членаў партыі і 2 кандыдатаў. Не гледзячы на кароткі перыяд часу, група правяла значную работу па разгортванню палітмасавай работы і падняццю прадукцыйнасці працы.

Сярод рабочых штодзенна праводзіцца чытка газет. Агітатарамі вылучаны комуністы — Палей і Штуркін, якія праводзяць гутаркі з рабочымі на розныя палітычныя тэмы, аб міжнародным становішчы.

Кандыдацкая група ўмела наладзіла кантроль над вытворчасцю. Яна наглядала за правільнай расстаноўкай рабочай сілы, мабілізавала рабочых на колькаснае і якаснае выкананне вытворчага плана.

У выніку поўгадовы план выканан датэрмінова,—па доўгаму валакну—на 115 проц., па кароткаму—на 153 проц.

Комуністы завода сваёй прыкладнай работай узначалілі вытворчы ўздым. Зараз завод па выкананню праграмы займае першае месца ў Віцебскай вобласці.

Вялікую работу прышлося правесці, пакуль дасягнулі гэтых поспехаў. Не раз на партыйных сходах заслухоўвалі даклады адміністрацыі аб рабоце завода. Крытыкавалі слабую работу асобных комуністаў, выкрывалі лодыраў, рвачоў, нарушальнікаў працоўнай дысцыпліны.

Зараз кандыдацкая група шырока разгортвае палітычную агітацыю па пытанню аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Ф. СКАМАРОШЧАНКА.

Падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных

КАМПАНІЯ ВЯЛІКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ ВАЖНАСЦІ

Надыходзячыя выбары ў мясцовыя Советы—кампанія вялікай дзяржаўнай важнасці.

Тварэц Канстытуцыі СССР—вялікі Сталін у дакладзе на XVIII з'ездзе ВКП(б) паставіў перад намі задачу: «Няўхільна праводзіць у жыццё нашу соцыялістычную Канстытуцыю, ажыццяўляць да канца дэмакратызацыю палітычнага жыцця краіны».

Выбраннем дэпутатаў у мясцовыя Советы завяршыцца перабудова ўсіх органаў дзяржаўнай улады ў СССР на аснове самага дэмакратычнага ў свеце ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні. Гэта яшчэ больш умацуе нашу соцыялістычную дзяржаву рабочых і сялян, зробіць Советы яшчэ больш магутнай зброяй у барацьбе за далейшы росквіт краіны соцыялізма, за далейшыя поспехі гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Канстытуцыя СССР указвае, што органы дзяржаўнай улады на месцах—Советы дэпутатаў працоўных—кіруюць усім мясцовым гаспадарчым і культурным будаўніцтвам, забяспечваюць ахову дзяржаўнага парадку, захаванне законаў і ахову правоў грамадзян, кіруюць дзейнасцю падпарадкаваных ім органаў управлення.

Задача надыходзячых выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных заключаецца ў тым, каб правесці ўсю выбарчую кампанію пад знакам ўсямернага паляпшэння работы Советаў, ліквідацыі недахопаў у іх дзейнасці, яшчэ большага набліжэння Советаў да мас, яшчэ лепшага задавальнення патрэб і запросаў насельніцтва, уздыму гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Мы павінны памятаць, што выбары ў абласныя, раённыя, гарадскія і сельскія Советы дэпутатаў працоўных будуць значна больш складанымі, чым папярэднія выбары. Дастаткова сказаць, што па Мінскай вобласці трэба будзе выбраць не менш 9431 дэпутата. Самая вялікая колькасць дэпутатаў — 7009 прыходзіцца на сельскія Советы. У выбарчых камісіях нашай вобласці будзе занята больш 47 тысяч чалавек.

Усё гэта гаворыць за тое, што чарговая выбарчая кампанія па свайму размаху будзе значна шырэй, чым кампанія па выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Асаблівае значэнне набывае большэвіцкая арганізацыя выбарчай кампаніі ў вёсцы. Трэба ўлічыць, што большасць выбаршчыкаў—гэта жыхары сяла, што найбольшую колькасць дэпутатаў прадстаіць выбраць у сельскія Советы.

Ва ўсіх раёнах Мінскай вобласці пачата падрыхтоўка да выбараў. Аднак, размах яе яшчэ далёка недастатковы. Па 12 раёнах вобласці вылучана 5636 агітатараў, арганізавана 4735 гурткоў, індывідуальнай агітацыяй ахоплена 108.544 чалавекі.

Па вобласці ў асноўным закончана работа па арганізацыі выбарчых округ і ўчасткаў.

Намечана стварыць 92 округі па выбарах у абласны Совет, 1261 па выбарах у райсоветы, 652 округі па выбарах у горсоветы, 418 округ па выбарах у гарадскія райсоветы і 7009 па выбарах у сельсоветы.

У радзе раёнаў і сельсоветаў нашай вобласці па-дзелавому рыхтуюцца да выбараў. Не дрэнна разгорнута работа па Уздзенскаму, Смалявіцкаму, Старобінскаму, Слуцкаму раёнах.

У Уздзенскім раёне, напрыклад, праведзены расшыраны пасяджэнні пленумаў сельсоветаў па пытанню аб падрыхтоўцы да выбараў, арганізавана 89 сходаў працоўных, працуе 356 гурткоў. Выдзелена група больш падрыхтаваных таварышаў для кіраўніцтва і дапамогі агіткалектывам, якія сістэматычна выязджаюць у сельсоветы.

Для правядзення культурна-масавай работы на вёсцы створана агітбрыгада, якая выязджае ў сельсоветы і калгасы. Лепш за ўсё пастаўлена работа па вывучэнню выбарчага закона ў Магільнянскім, Сямёнаўскім, Пырашаўскім, Лошанскім, Прысынкаўскім і Камянецкім сельсоветах. Горш абстаіць справа па Стальбоўскаму, і Хатлянскаму сельсоветах.

Грандыёзны размах перадвыбарчай работы патрабуе не толькі сабраць і скарыстаць стары актыў, які працаваў у часе мінулых выбараў, але і значна папоўніць яго новымі актывістамі, агітатарамі і бяседчыкамі. Трэба ўзняць з народных глыбінь тысячы новых таленавітых совецкіх людзей, у першую чаргу совецкую інтэлігенцыю, верных сыноў нашай радзімы і далучыць іх да актыўнай грамадскай работы. У Смалявіцкім раёне правільна падышлі да вырашэння гэтай важнейшай задачы. Па ўсіх сельсоветах і прадпрыемствах раёна падабрана 1116 агітатараў, у тым ліку 548 агітатараў, працаваўшых у часе мінулых выбараў, і 568 новаўпягнутых. З агульнага ліку 1116 чалавек—182 члены і кандыдаты партыі, 466 беспартыйных і 468 комсамольцаў.

Вялікае месца ў падрыхтоўчай рабоце павінна быць удзелена справаздачам дэпутатаў перад сваімі выбаршчыкамі. Кожны дэпутат абавязан адчытацца за сваю работу. Справаздачы дэпутатаў павінны быць старанна падрыхтаваны і абмеркаваны на шырокіх сходах выбаршчыкаў. Гэту работу неабходна закончыць не пазней 10 кастрычніка. У многіх раёнах прыступілі ўжо да гэтай справы. Так, у Смалявіцкім раёне да 1 верасня 1939 года зрабілі справаздачы 47 членаў сельсоветаў.

Добра праведзенай арганізацыйна-падрыхтоўчай работай мы павінны забяспечыць пагалоўны ўдзел выбаршчыкаў у надыходзячых выбарах, дабіцца далейшага ўздыму палітычнай актыўнасці мас і прыцягнення новых слаёў працоўных да ўпраўлення дзяржавай.

А. ЦЁМКІН,
старшыня Оргкамітэта Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР па Мінскай вобласці.

ЯК МЫ РЫХТУЕМСЯ ДА ВЫБАРАЎ

Падрыхтоўку да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных Сталінскі райсавет горада Мінска пачаў адразу пасля зацвярджэння выбарчага закона на II Сесіі Вярхоўнага Совета БССР. Перш за ўсё мы ўдакладнілі колькасць насельніцтва раёна і кожнага дома ў паасобку.

У надыходзячых выбарах працоўных нашага раёна павінны выбраць 194 дэпутаты, з іх у райсавет — 104, Мінгорсавет — 86 і ў абласны Совет дэпутатаў працоўных — 4. Тэрыторыя раёна разбіта на 26 выбарчых участкаў. Для кожнага ўчастка падабралі добрыя, утульныя памяшканні.

У акруговых і ўчастковых выбарчых камісіях у нас будзе працаваць 1337 чалавек. Партыйныя, профсаюзныя і грамадскія арганізацыі, а таксама ўстановы і прадпрыемствы падбіраюць для гэтай мэты сваіх лепшых актывістаў.

Каля 100 агітатараў прайшлі сямідзённыя курсы з адрывам ад вытворчасці. Апрача гэтага на прадпрыемствах працуюць дзесяцідзённыя курсы агітатараў без адрыву ад вытворчасці.

Мы правялі сходы выбаршчыкаў на ўчастках. На сходах сталі даклады аб выніках унечарговай Чацвертай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР і аб падрыхтоўцы да выбараў. Правялі таксама спецыяльны раённы сход хатніх гаспадынь і нараду рэдактараў насценных газет.

Будзем па-баявому рыхтавацца да прадстаячых выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, каб правесці іх больш арганізавана, чым папярэднія кампаніі.

З. БАРАВАЯ,
нам. старшыні оргкамітэта Мінгорсавета па Сталінскаму раёну.

—⊙—

СПАЛУЧАЮЦЬ ПАЛІТЫЧНУЮ РАБОТУ З ГАСПАДАРЧАЙ

У Дзержынскім раёне пачалася інтэнсіўная падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Будуць арганізаваны 45 выбарчых округ па выбарах у раённы Совет дэпутатаў працоўных, 340 округ па выбарах у сельскія Советы і 29 выбарчых участкаў. У раёне падабраны і абсталёўваюцца памяшканні для выбарчых участкаў. Ідзе таксама падбор кандыдатур у састаў членаў акруговых і ўчастковых выбарчых камісій.

Шырока разгарнулася агітацыйна-масавая работа. 412 агітатараў праводзяць палітычную агітацыю сярод насельніцтва. У Негарэльскім сельсавеце працуюць 66 агітатараў, якія абслугоўваюць 1.500 калгаснікаў. У раённым пэнтры арганізавана 58 гурткоў хатніх гаспадынь. Асабліва добра працуюць агітатары тт. Анкут, Цімошка, Лапковіч, Махліс, Беляева, Яны старанна рыхтуюцца да заняткаў і праводзяць іх жыва і цікава. Агітатар — урач тав. Беляева шырока скарыстоўвае наглядныя матэрыялы — карты, дыяграмы і інш. Агітатары часта абмеркоўваюць вопытам сваёй работы. Рад гурткоў ужо вывучыў матэрыялы Другой Сесіі Вярхоўнага Совета БССР, а зараз вывучае Палажэнне аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Рыхтуючыся да выбараў, мы разгарнулі агітацыю за паспяховае завяршэнне сельскагаспадарчага года. Рад калгасаў правёў сяўбу азімых. Напрыклад, калгасы Станькаўскага сельсавета да 5 верасня закончылі поўнасцю сяўбу азімых, засеяўшы замест 901 гектара па плану 961 гектар.

Нядаўна мы правялі нараду старшынь сельсоветаў, загадчыкаў дамамі соцкультуры, дзе абмеркавалі пытанні падрыхтоўкі да выбараў.

С. П. САЎЧАНКА,
загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Дзержынскага РК КП(б)Б.

КАЛГАСНІКІ ВЫВУЧАЮЦЬ ВЫБАРЧЫ ЗАКОН

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА. У калгасах раёна шырока разгорнута перадвыбарчая агітацыйная работа.

Партыйная арганізацыя Малышэвіцкага сельсавета кіраўнікамі гурткоў вылучыла 54 агітатары. Яны ў сваёй рабоце скарыстоўваюць вопыт агітацыйнай работы, набыты імі ў часе правядзення выбараў ў Вярхоўныя Советы СССР і БССР. У калгасе імені Кірава 12 агітатараў раз'ясняюць выбарчы закон па дзесяцідворках. Заняткі наведваюць больш 200 калгаснікаў. Агітатары тт. Талпека, Ярмола, Буранкова ўжо правялі па 8—10 заняткаў. Апрача вывучэння Палажэння аб выбарах агітатары раз'ясняюць калгаснікам міжнароднае становішча.

У пагранічным Макранскім сельсавеце працуе 16 агітатараў. Тт. Касач Андрэй, Баркоўскі Васіль, Бычкоўская Ольга па сваіх дзесяцідворках правялі па 7—8 заняткаў.

Вялікую дапамогу ў агітацыйнай рабоце аказваюць пагранічнікі. У калгасе «Чырвоны вартаўнік» і «Чырвоны працаўнік» пагранічнікамі зроблена 4 даклады аб міжнародным становішчы На сходзе прысутнічала каля 600 чалавек.

(БЕЛТА).

НЕАДКЛАДНЫЯ ЗАДАЧЫ МЯСЦОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

(ПА МАТЭРЫЯЛАХ НАРАДЫ РАБОТНІКАЎ МЯСЦОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ ПРЫ ЦК КП(б)Б)

Праведзеная ЦК КП(б)Б нарада па пытанню аб развіцці мясцовай прамысловасці і промкааперацыі, па агульнаму прызнанню яе ўдзельнікаў, павінна адыграць вялікую ролю ў справе ажыццяўлення дырэктыў XVIII з'езда ВКП(б) аб усямерным развіцці гэтай галіны народнай гаспадаркі.

Але трэба загадзя падкрэсліць, што такую ролю нарада адыграе толькі ў тым выпадку, калі абласныя і раённыя совецкія, партыйныя, гаспадарчыя і кааператыўныя арганізацыі сапраўды па-большэвіцку развяжуць мясцовую гаспадарчую ініцыятыву. Задача заключаецца ў тым, каб ужо на працягу астаўшыхся месяцаў 1939 года і першай палавіны будучага—1940 года стварыць шырокую сетку новых дробных прадпрыемстваў па вырабу тавараў шырокага спажывання па базе мясцовай сыравіны. Важна таксама, каб кожная прапанова, унесеная ўдзельнікамі нарады, знайшла практычнае вырашэнне.

ВІЦЕБСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

Рад важных пытанняў узнялі выступаўшыя на нарадзе таварышы з Віцебскай вобласці. Абласныя арганізацыі справядліва падвергліся сур'ёзнай крытыцы за тое, што, не гледзячы на наяўнасць амаль ва ўсіх раёнах багацейшых запасаў торфу, яны завезлі ў 1938 годзе 50 тысяч тон торфу і прадаўжаюць завозіць яго ў значнай колькасці і ў гэтым годзе.

Ужо ў 1940 годзе неабходна поўнасцю адмовіцца ад завозу торфу ў Віцебскую вобласць. Што для гэтага неабходна зрабіць? Часткова на гэтае пытанне адказаў выступаўшы на нарадзе загадчык Віцебскага аблплана тав. Груздзёў. Разгорнута падрыхтоўка да асваення новых пяці балот. Яны змогуць даць 35 тысяч тон торфу. Неабходна-ж, каб поўнасцю задаволіць мінімальныя патрэбы вобласці, здабываць у 1940 годзе далаткова не менш 85 тысяч тон. Таму патрэбна асвоіць распрацоўку яшчэ 5 балот: трох у Віцебскім раёне, аднаго ў Багушэўскім і аднаго ў Аршанскім.

Суражская папяровая фабрыка да гэтага часу спальвала штогод 25 тысяч кубаметраў дроў. Між тым, пад бокам у яе ёсць багацейшыя запасы торфу. Трэба прымусіць дырэкцыю неадкладна прыступіць да асваення гэтых залежаў, папярэдзіўшы яе, што дрывамі фабрыка снабжацца больш не будзе.

Па рашэнню СНК БССР у Лепелі павінен быць пабудаван чарапічны завод. Зараз туды завозіцца чарапіца з іншых раёнаў. Чаму-ж не будуецца завод? Аказваецца, увесь тормаз у тым, што не атрыман аналіз гліны. Яго павінен зрабіць віцебскі завод. Але ён не спяшаецца з гэтай справай.

Асабліва дрэнна абстаіць справа з абслугоўваннем насельніцтва бытавым рамонтам. Ва многіх раёнах няма металарамонтных майстэрань. У Суражскім раёне, як гэта выявіла брыгада ЦК КП(б)Б, абследваўшая Віцебскую вобласць, ёсць больш 500 швейных машын, 300 веламашын, значная колькасць хатняга металаінвентару: прымусоў, гарэлак, вёдзер. Рамонт і рэстаўрацыя гэтага інвентару амаль не магчыма з-за адсутнасці рамонтных майстэрань. Такое-ж становішча ў Гарадоцкім і радзе іншых раёнаў вобласці. Нават у самым Віцебску ёсць толькі адна металарамонтная майстэрня, у якой працуюць... два чалавекі. Віцебскія арганізацыі павінны прыняць меры к таму, каб у 1939 годзе стварыць у кожным раёне не менш адной металарамонтнай майстэрні, а ў буйных раёнах па дзве—тры. Акрамя таго, трэба арганізаваць перасовачныя майстэрні, якія змаглі-б шырока абслужыць насельніцтва.

ГОМЕЛЬСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

У Гомельскай вобласці таксама ёсць багацейшыя нескарыстаныя рэсурсы для развіцця мясцовай прамысловасці і промкааперацыі. Аб бліжэйшых задачах у гэтым напрамку гаварылі на нарадзе дэлегаты Гомельскай вобласці. Перш за ўсё, трэба фарсіраваць будаўніцтва прадпрыемстваў Лоеўскага райпромкамбіната: млына, у будаўніцтва якога ўкладваецца 300 тысяч рублёў, металамайстэрні — 100 тыс. руб., і асваенне новага торфбалота. Такая-ж задача стаіць у адносінах будаўніцтва чарапічнага завода ў Добрушскім раёне.

Асаблівай увагі заслугоўвае ўзнятае пытанне аб стварэнні ў Нова-Беліцы на базе мясцовай сыравіны завода па выпрацоўцы пластмасы, а таксама тэкстыльнай фабрыкі на базе рэсурсаў бавоўны, якая ёсць у Облтэкстыльпромсаюзе. Аблплан абавязан падрабязна распрацаваць гэтыя пытанні, прадставіўшы ў бліжэйшы час абгрунтаваныя тэхніка-эканамічныя разлікі.

Гомельская прамысловасць мае вялікія адыходы, якія зараз вельмі дрэнна скарыстоўваюцца На нарадзе прыводзіўся такі анекдатычны прыклад. Паравоза-вагонарамонтны завод узяўся ў першым квартале 1939 года за «асваенне» самаварных труб і выпусціў іх... 3 штукі. Нова-Беліцкі дрэваапрацоўчы камбінат спальвае штомесяц сотні кубаметраў каштоўнейшай драўніны, якая магла-б быць скарыстана прадпрыемствамі мясцовай прамысловасці для вырабу рознастайнага асартымента тавараў шырокага спажывання. Нерацыянальна скарыстоўваюцца таксама адыходы абутковай фабрыкі «Праца».

Праблему скарыстання адыходаў неабходна, нарэшце, вырашыць арганізавана шляхам планавага прымацавання прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці і промкааперацыі да адпаведных дзяржаўных прадпрыемстваў. За гэту справу павінен у самы бліжэйшы час узяцца Дзяржплан БССР.

Выключна дрэнна абстаіць у Гомельскай вобласці справа з развіццём мясцовай харчовай прамысловасці. Звычайны квас у Рагачоўскі і Жлобінскі раёны завозіцца з Магілева. У Добрушскім і радзе іншых раёнах няма булачна-кандзіцерскіх вытворчасцей і т. д. Ясна, што такое становішча далей цярпець нельга. Гэтыя вытворчасці павінны быць створаны ў раёнах у найкарацейшыя тэрміны.

Нямалаважныя пытанні ўзняў у сваім выступленні сакратар Рагачоўскага РК КП(б)Б тав. Свярдлоў. Рагачоўскі завод згушчонага малака можа выпрацоўваць значную колькасць малочна-харчовых прадуктаў для акружаючых раёнаў. Ён можа дадаткова да асноўнай сваёй прадукцыі вырабляць бестлушчавы сыр, згушчонку і т. д. Там прабавалі вырабляць гэтыя прадукты, але не знайшлі спажыўца. Гандлюючым арганізацыям трэба зацікавіцца гэтай справай. Значны інтарэс прадстаўляе вопыт Рагачоўскага раёна, дзе арганізавана арцель па вырабу мешкавой тары з адыходаў тэкстыльнай прамысловасці і некандыцыйнай ільнотрасты, якая ў значнай колькасці ёсць у калгасах. Такія арцелі можна і трэба арганізаваць ва многіх раёнах..

Профіль мясцовай прамысловасці, яе размяшчэнне і пытанні кіраўніцтва.

Гэтыя тры пытанні непарыўна звязаны паміж сабой і павінны быць вырашаны такім чынам, каб стварыць найбольш спрыяючыя ўмовы для далейшага быстрага развіцця мясцовай прамысловасці.

Буйнейшай задачай усёй нашай рэспублікі з'яўляецца ліквідацыя адставання і забеспячэнне быстрага ўздыму мясцовай прамысловасці Палескай вобласці. Прычым, гэту задачу можна і трэба ў значнай меры вырашыць у 1939—1940 гг. На багаццю мясцовых рэсурсаў Палеская вобласць не толькі ўступае іншым абласцям, а, наадварот, ва многім пераўзыходзіць іх.

Максімальна скарыстаўшы гэтыя рэсурсы, трэба ва ўказаны перыяд узняць удзельную вагу мясцовай прамысловасці Палескай вобласці да 13—15 процантаў усяго аб'ёму мясцовай прамысловасці рэспублікі. Зразумела, што рашаючае значэнне тут адыграе ініцыятыва абласных і раённых партыйных, совецкіх і гаспадарчых арганізацый. Ясна таксама і тое, што цэнтральныя арганізацыі і ўпершую чаргу Наркаммясцпром, Дзяржплан і Наркамхарчпрэм павінны аказаць тут вялікую дапамогу.

Абсалютна няправільным з'яўляецца існуючае зараз становішча, калі 61 проц. усяго аб'ёму вытворчасці прамысловай кааперацыі падае на 10 буйнейшых гарадоў рэспублікі і толькі 39 проц. на ўсе раёны. А па лініі мясцовай прамысловасці толькі прыкладна 50 процантаў усёй прадукцыі вырабляецца ў раёнах. У бліжэйшыя годы неабходна рэзка змяніць гэтае становішча, **павялічыўшы ўдзельную вагу мясцовай прамысловасці і прамысловай кааперацыі сельскіх раёнаў.**

XVIII з'езд партыі ўстанавіў, што галоўнай задачай прамысловай кааперацыі і мясцовай прамысловасці з'яўляецца выраб тавараў масавага спажывання. На нарадзе было ўстаноўлена, што многія работнікі гэтай галіны народнай гаспадаркі недастаткова зразумелі ўказанні XVIII з'езда партыі.

Ва ўсім аб'ёме мясцовай прамысловасці прадметы шырокага спажывання займаюць толькі 18 проц. або 9 мільёнаў рублёў з 49 мільёнаў. Сярод соцень арцелей промкааперацыі ў абласцях і раёнах толькі дзесяткі вырабляюць прадметы, на якія насельніцтва прад'яўляе шырокі попыт. З такім становішчам нельга далей мірыцца.

Мясцовая прамысловасць і промкааперацыя павінны ў далейшым так развівацца, каб дапаўняць дзяржаўную прамысловасць і найбольш шырока разгортваць выраб тых прадметаў і прадуктаў, якія яшчэ ў недастатковай колькасці выпускаюць дзяржаўныя прадпрыемствы. Неабходна таксама ліквідаваць аднабокасць у развіцці мясцовай прамысловасці і ўстанавіць, што яна займаецца вытворчасцю ўсіх тых прадметаў масавага спажывання (харчовых, швейных, галантарэйных, металавырабаў, мэблі, абозных вырабаў т. д.), якія могуць вырабляцца на базе мясцовай сыравіны і адыходаў дзяржаўнай прамысловасці.

Ва ўмовах нашай рэспублікі асаблівую ўвагу трэба таксама звярнуць на далейшае максімальнае развіццё мясцовай торфаздабываючай прамысловасці і прадпрыемстваў па вырабу будаўнічых матэрыялаў. Кожны раён павінен поўнасцю задавальняць свае ўласныя патрэбы ў палівe і будматэрыялах сіламі сваёй-жа раённай прамысловасці.

Вялікую дапамогу ў развіцці мясцовай прамысловасці павінны аказаць дзяржаўныя прадпрыемствы саюзнага і саюзна-рэспубліканскага значэння. На нарадзе ў гэтых адносінах была толькі адна канкрэтная прапанова. Мы маем на ўвазе заяву ўпраўляючага Белмецізтрэста тав. Гарэліка, што трэст бярэцца сіламі сваіх прадпрыемстваў дапамагчы арганізацыі 9 металарамонтных майстэрняў. Гэту ініцыятыву трэба шырока падтрымаць.

Кожнае прадпрыемства абавязана тэрмінова распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па аказанню соцыялістычнай дапамогі раённай прамысловасці. Дапамога гэта можа і павінна быць самай рознастайнай: арганізацыя майстэрняў па рамонту металавырабаў, абутку, адзення, трыкатажу і т. д., перадача некаторага непатрэбнага прадпрыемству-шэфу абсталявання, тэхнічная кансультацыя, пасылка спецыялістаў для дапамогі ва ўстаноўцы абсталявання, распрацоўка праектаў і каштарысаў для новабудуючыхся дробных прадпрыемстваў сіламі тэхнічных аддзелаў і бухгалтэрыі і т. д. Дырэктары прадпрыемстваў, партыйныя і прафесіянальныя арганізацыі павінны асазнаць усю важнасць такой соцыялістычнай дапамогі і, не чакаючы дырэктыў, узяцца практычна за гэту справу.

Карэнным чынам трэба перабудаваць кіраўніцтва мясцовай прамысловасцю. У рэспубліканскім маштабе гэта задача павінна быць поўнасцю ўскладзена на Народны камісарыят мясцовай прамысловасці. Большасць выступаўшых на нарадзе таварышаў аднадушна зышлася на тым, што пры Наркаммясцпроме трэба стварыць моцнае упраўленне раённай і абласной прамысловасцю з адпаведнымі аддзеламі. У абласцях побач з аблмясцпромамі мэтазгодна арганізаваць канторы па снабжэнню і збыту, якія будуць працаваць на аснове гаспадарчага разліку.

У раёнах пры райвыканкомах павінны быць арганізаваны раённыя аддзяленні мясцовай прамысловасці, а там, дзе яны ёсць, іх трэба ўмацаваць работнікамі. Асноўнай арганізацыйнай формай гаспадарчых аб'яднанняў мясцовай прамысловасці павінны з'явіцца райпромкамбінаты, якія неабходна ўсямерна ўмацоўваць.

Партыя Леніна—Сталіна, совецкі ўрад стварылі ўсе ўмовы для рэзкага павелічэння выпуску тавараў шырокага спажывання. Справа чэсці ўсіх партыйных і непартыйных большэвікоў шырока скарыстаць багатыя мясцовыя рэсурсы і ператварыць раённую і абласную прамысловасць БССР у перадавую галіну народнай гаспадаркі.

А. РАБІНОВІЧ.

Соцыялістычнае спаборніцтва ільнаводаў БССР, Смаленскай і Калінінскай абласцей

ЗА ПЯРШЫНСТВА Ў СПАБОРНІЦТВЕ

ЧАВУСЫ. (Спец. кар. «Звязды»). Далёка за прэзеламі раёна вядомы імёны знатных звеннявых — ільнаводаў калгаса «Юны комунар», Благавіцкага сельсовета — ордэнаносца Анны Кондзеравай і яе падруг Пелагеі і Анны Варазловых.

У барацьбе за высокія ўстойлівыя ўраджаі ільну звенні Кондзеравай і Варазловых дабіліся выдатных поспехаў. У мінулым годзе звяно Анны Кондзеравай атрымала 12,6 цнт. ільновалакна з гектара, Пелагеі Варазловай — 12,4 цнт. і Анны Варазловай — 11,6 цнт. Іх звенні з'яўляюцца ўдзельнікамі Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

Ураджайнасць ільну расце з года ў год. У 1936 годзе — у першым годзе сваёй работы — звяно Анны Кондзеравай зняло ўраджай ільновалакна па 7 цнт. з гектара. Звяно не спынілася на дасягнутым. Прымяненне перадавой агратэхнікі: жнівеньскае зяблівае ворыва, пасеў у раннія спелыя тэрміны чыстасортным насеннем на добра апрацаванай і угноенай глебе, старанны дагляд і падкормка пасеваў — забяспечыла атрыманне высокіх ураджаяў. У наступным 1937 годзе звяно зняло ўраджай высокаякаснага валакна 12,3 цнт. з гектара.

Самым неспрыяючым для развіцця пасеваў быў засушлівы 1938 год. Але высокая агратэхніка перамагла засуху. Звяно атрымала 12,6 цнт. ільновалакна і 8,6 цнт. ільносемя з гектара. Яшчэ больш высокіх ураджаяў дабілася звяно Анны Кондзеравай сёлета. Аграномы, агледзеўшы лён з яе ўчастка, вызначылі, што сёлетні ўраджай складзе не менш 14 цнт. з гектара высоканумарнага ільновалакна.

У гэтым годзе на Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ад калгаса ўдзельнічаюць толькі 3 звяны. Сёлета ў калгасе праводзіцца вялікая работа, каб завяваць права ўдзелу ўсяго калгаса на выстаўцы 1940 года.

18 звенняў уважліва і крапатліва даглядалі пасевы ільну на плошчы 35 гектараў. Па папярэдніх падліках у гэтым годзе з усёй плошчы калгас атрымае высоканумарнага ільновалакна не менш 7 цнт. з гектара.

Ільнаводчыя звенні чацвертай брыгады Веры Кіраевай, Каці Астапенка і Васіля Арлова знялі з плошчы 7 гектараў высокі ўраджай ільносемя: каля 12 цнт. з гектара.

Ільнаводы калгаса абавязаліся здаць сёлета дзяржаве частку ільнопрадукцыі нумарам 26 і вышэй. Для атрымання высокакаштоўнага ільновалакна яшчэ пры цербленні была старанна падабрана лепшая ільносаломка, якая асобна разаслана. За ільнам на сцелішчы арганізаван уважлівы догляд.

Нядаўна тры падругі—звеннявыя—наведалі Ўсесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку.

— Мы ўважліва агледзелі ўсе павільёны выстаўкі, асабліва нас цікавілі экспанаты ільну, — расказвае Анна Ільінічна. — Добра азнаёміліся з работай лепшых ільнаводаў Калінінскай і Смаленскай абласцей, з якімі наша рэспубліка падпісала дагавор на сацыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай ільну.

— На нашай беларускай зямлі добра родзіць лён. Трэба толькі па-сапраўднаму ўзяцца ўсім калгаснікам за вырошчванне гэтай культуры і мы не толькі выканаем узятыя абавязапельствы, а на многа іх перавыканаем. Наша рэспубліка павінна стаць перадавой па ільнаводству.

Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «Юны комунар» ужо пяпер пачалі барацьбу за высокі ўраджай ільну будучага года, за паспяховае выкананне дагавора з ільнаводамі Смаленскай і Калінінскай абласцей, які падпісала ад імя ільнаводаў БССР лепшая звеннявая калгаса Анна Кондзерава.

Кожнае ільнаводчае звяно калгаса ўжо ведае свой участак. Пад пасеў ільну будучага года ў калгасе паднята пад зяблева 31 гектар канюшынішча. Для ўгнаення сваіх участкаў звенні праводзяць збор попелу і курынага памёту.

Ільнаводчыя звенні калгаса ўпорна рыхтуюцца атрымаць у 1940 годзе высокі ўраджай ільну і заваяваць пяршынства БССР у спаборніцтве з ільнаводамі Калінішчыны і Смаленшчыны.

С. КАЗНАЧЭЕЎ.

НЕДААЦЭНЬВАЮЦЬ РАННЯЕ ЗЯБЛІВА

ХАЛОПЕНІЧЫ. (Спец. кар. «Звязды»). Ранняе вераснёўскае ворыва пад зяблева— адзін з найбольш эфектыўных агратэхнічных прыёмаў у павышэнні ўраджайнасці. Ранняе зяблівае ворыва садзейнічае лепшаму захаванню ў глебе вільгаці, зніжае засмечанасць палёў пустазеллем. Перадавыя калгасы шырока прымяняюць гэты агратэхнічны прыём. Аднак, з ім чамусьці не лічацца ў Халопенічах. На 10 верасня з планавых 14.530 гектараў па раёну паднята зяблева толькі 328 гектараў — 2,2 проц. плана. За 10 дзён (з 1 па 10 верасня) паднята толькі 72 гектары.

Упускаюць лепшыя тэрміны зяблівага ворыва калгасы Кашчынскага і Бараньскага сельсоветаў (старшыні тт. Нікаланак і Анет). У Ўзнацкім сельсавеце ўзаралі пад зяблева ўсяго 4 гектары пры плане ў 1.100 гектараў. Столькі-ж паднялі зяблева ў Хацюхоўскім і Хальнявіцкім сельсоветах.

Калгас «Новае жыццё», Халопеніцкага пасяловага совета, павінен падняць 235 гектараў зяблева. Аднак, ворыва не пачыналі. Праўленне калгаса спадзяецца, што гэтую работу выканае МТС. А між тым у калгасе дастаткова конскай цягавай сілы, якая не скарыстоўваецца на ворыве.

Вельмі дрэнна выкарыстоўваецца магутны трактарны парк раёна. Трактары не пераведзены на кругласутачную работу. Большасць іх тыднямі прастойвае на полі. У Янаўскай МТС каля поўмесяца не працуюць 5 трактараў. Два трактары «ХТЗ» не адрамантаваны, тры стаяць з-за «адсутнасці» трактарыстаў, а апошнія скарыстоўваюцца не па прызначэнню.

Дырэкцыя МТС (дырэктар тав. Шуб) не ведае, як працуюць трактарысты, не прыслухоўваецца да іх скарг, не дапамагае ў рабоце. Як вынік, трактарным паркам МТС узарана пад зяблева ўсяго 16 гектараў пры плане ў 1.500 гектараў.

Не ўдзяляюць патрэбнай увагі па падняццю ранняга зяблева і кіруючыя арганізацыі раёна.

Ф. РУЦКІ.

СТАХАНАЎСКАЯ РАБОТА ДАЕ СВАЕ ПЛАДЫ

Звеннявой па ільну я працую першы год. Маё звяно было арганізавана яшчэ зімой. Мы паставілі перад сабой задачу— дабіцца высокага ўраджаю ільну.

Усю зіму збіралі попел і курыны памёт. Нам быў адведзен участак у 8,5 гектара. Старанна апрацавалі яго, перад пасевам унеслі попел, лён сеялі радковай сеялкай. Рос лён хутка, калі дасягнуў 5 сантыметраў, мы зрабілі падкормку растворам курынага памёту. Два разы палолі. Лён вырас выдатны, вышынёю больш метра.

Цербленне праводзілі падвойнае. Хутка лён абмалацілі на малатарні «ЭДЗІ». Усе члены звяна працавалі з выключным энтузіязмам. Асабліва добра працавала 50-гадовая калгасніца Дар'я Грэбская, якая сваю дзённую норму выконвала на 200 і больш процантаў.

Наша стаханаўская работа дала свае плады. З участка ў 2,5 гектара мы намалацілі па 10 цэнтнераў ільносемя з гектара, а з астатніх 6 гектараў па 9 цэнтнераў. Ільносемя здалі дзяржаве. Я ўпэўнена, што высокі ўраджай мы атрымаем і па ільновалакну. Увесь лён разаслалі на добра падрыхтаваным сцелішчы, праз некалькі дзён прыступім да падняцця і здачы трасты.

Усё наша звяно змагаецца за права ўдзелу ва Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў 1940 годзе.

Р. А. ЯКАЎЛЕВА,— звеннявая па ільну калгаса «Чырвоная Ніва», Шклоўскага раёна.

ДАРОГА ТВОРЧАСЦІ

Ён трышоў дамоў ўсхваляваны і задумлівы. Ён быў пад уражаннем праслуханай лекцыі прафесара. Трэба было сабрацца з мыслямі, прывесці іх у стройны парадак, у сістэму. Гэта адразу не ўдавалася. Мысліі наскаквалі адна на адну і... нічога гарманічнага, стройнага не атрымлівалася. Профіль... квадрат.... закругленыя вуглы... Дзе пачатак, дзе канец?

О, як сладасны і хвалюючы мінуты і гадзіны шуканняў новага, нязведанага, пакрытага туманам невядомасці!

Усё здаецца так проста і так складана...

Студэнт механічнага факультэта Політэхнічнага інстытута Вульф Саламонавіч Эйг нахіліўся над сталом і думаў:—Трэба знайсці асноўнае, галоўнае. Але як? З чаго пачаць?

Прафесар гаварыў аб станку па абточцы квадратных зліткаў. Гэты станок нямецкай фірмы Вальдрых. Ён мае многа недахопаў. Ён складаны, дарагі. І галоўнае— гэта чужая, заграніччная марка. А ці нельга зрабіць такі-ж станок айчыннай, савецкай маркі? Каб гэты станок быў больш простым і, вядома, лепш заграніччнага!

І тав. Эйг рашыў такі станок вынайсці. Гэта была вельмі складаная задача. Гэта было звязана з вялікімі труднасцямі. Але хіба што-небудзь новае, значнае даецца лёгка? Хіба што-небудзь вялікае і складанае прыходзіць без максімальнага напружання розуму, без узмоцненай, канцэнтраванай работы мозга?

Спачатку гэта была мара. Потым пачаліся шуканні: вялікія, напружаныя, упорныя.

Ажыццявілася-ж яго мара аб тым, каб стаць інжынерам?

А калісьці ў стары дарэволюцыйны час хіба мог думаць стары Эйг, што яго сын стане інжынерам, «выйдзе ў людзі».

... У невялікім мястэчку жыў яго бацька. Ён быў столярам. У мястэчку аб ім гаварылі так:

— Рэб Шолам Эйг? О, гэта вядомы бядняк.

І калі, бывала, пыталі ў Шолама Эйга, як ён жыве, чаго ў яго нехапае, ён адказваў з ўсмешкай на вуснах:

— Так усяго хапае, усё ёсць, а вось з хлебам крыху тугавата.

У сапраўднасці так і было. У доме Эйга было ўсё: гора, слёзы, нішчата. Аднаго не было: хлеба і да хлеба.

Гэта быў час «чарты аседласці», яўрэйскіх пагромаў і «процантнай нормы».

Аб вучобе сваіх дзяцей Шолам Эйг гаварыў так:

— Я разумею, дзеці павінны вучыцца. Было-б зусім не дрэнна, калі-б мой Вульф стаў інжынерам. Але паспрабуй вучыць дзяцей, калі над тваёй галавой вісіць «процантная норма»...

Совецкая ўлада, партыя большэвікоў ліквідавалі «чарту аседласці» і «процантную норму». І сын Шолама Эйга вучыцца ў совецкім інстытуце і будзе совецкім інжынерам.

Дапытлівы мозг будучага інжынера не ведаў спакою. Маладая энергія бушавала ў душы Вульфа. Яна шукала выхаду на шырокую дарогу творчасці.

І яшчэ адно пачуццё валодала маладым студэнтам. Ён—совецкі грамадзянін. Краіна дала яму ўсё: магчымасць вучыцца, працаваць, тварыць. Краіна акружыла яго клопатамі. Яна адкрыла яму дарогу ў жыццё, к радасці і шчасцю. І ён адчуваў сябе як-бы даўжнікам перад сваёй краінай. Гэты доўг трэба пажрыць, трэба нітосьці такое зрабіць, каб хоць у некаторай ступені аддзякаваць радзіму за клопаты аб сваім сыне.

Так нараджаецца ідэя.

Тав. Эйг думаў над вынаходніцтвам новага станка па абточцы квадратных зліткаў, станка совецкай маркі.

Пачатак быў знойдзен. Прадстаяла перш за ўсё выбраць новы профіль для квадратных зліткаў. Існуючы стандартны профіль—квадрат з закругленымі вуглямі мае многа недахопаў.

І новы профіль быў знойдзен. Гэта быў плод многіх бяссонных начэй, высокага напружання мозгу і вялікай работы мысліі.

І далей быў вынайдзен новы станок. Прайшло паўтара года ўпорнай работы ў сценах інстытута і дома. Якімі хваляваннямі і радаснямі быў запоўнен гэты час! Шлях навукова-даследчага работніка, вынаходцы—нялёгкі шлях. А затое, якая радасць стаіць у калыбелі свайго дзецішча!

Маскоўскі эксперыментальны навукова-даследчы інстытут металарэжучых станкоў даў добры водзыў аб вынаходніцтве тав. Эйга. У наркамаце сярэдняга машынабудаўніцтва разглядваецца пытанне аб перадачы мадэлі станка на адзін з заводаў.

І быць можа, не ў далёкім будучым на нашых заводах паявяцца новыя айчынныя, совецкія станкі сістэмы маладога совецкага інжынера, выхаванца Беларускага політэхнічнага інстытута — Вульфа Саламонавіча Эйга.

С. КУНЯЎСКІ.



НА ЗДЫМКУ: група студэнтаў і прафесарска-выкладчыцкі персанал Беларускага політэхнічнага інстытута. Фото В. А. Баранава (фотахроніка БЕЛТА).

КАЛГАСНА-СОЎГАСНЫЯ ТЭАТРЫ БССР У НОВЫМ СЕЗОНЕ

Пачаўся новы тэатральны сезон. Тэатры рэспублікі пакажуць у наступным сезоне многа новых п'ес гледачу, пакажуць новыя дасягненні сваіх актораў, рэжысёраў, мастакоў.

Калгасна-соўгасныя тэатры БССР сустракаюць новы тэатральны сезон значна ўзмацненымі, вырасшымі. Праведзены ў маі гэтага года першы ўсебеларускі фестываль калгасна-соўгасных тэатраў паказаў, што ў асобе нашых калгасна-соўгасных тэатраў мы маем творча сфарміраваўшыяся калектывы, якія нясуць у калгасную масу сапраўднае тэатральнае мастацтва.

На першым усебеларускім фестывалі выдзелен для ўдзелу ва ўсесаюзным фестывалі калгасна-соўгасных тэатраў у Маскве Заслаўскі тэатр са спектаклем «Партызаны» К. Крапівы. Упорна, з вялікім уздымам працаваў увесь калектыў над паляпшэннем свайго спектакля перад паездкай у Маскву.

У сумеснай рабоце рэжысёры П. А. Данілаў — мастацкі кіраўнік тэатра і Ю. Г. Палічынецкі шліфавалі кожную дэталь у спектаклі, яшчэ і яшчэ раз правяралі кожны вобраз, дабіваючыся максімальнага раскрыцця здольнасцей кожнага з маладых выканаўцаў.

І работа гэта дала належныя рэзультаты. На ўсесаюзным фестывалі ў Маскве спектакль заслаўцаў адзначан як адзін з лепшых. Выканаўцы, рэжысёры, мастакі атрымалі добрыя ацэнкі маскоўскай крытыкі. Заслаўскі тэатр паказаў у Маскве сапраўды культурны, выдатна зладжаны спектакль, спектакль, сыграны маладымі акторамі, нядаўна вырасшымі ў калектывах мастацкай самадзейнасці, з пакараючай шчырасцю і ўздымам.

Такім чынам, зусім малалое мастацтва калгасна-соўгасных тэатраў БССР на ўсесаюзным агляднзе мацнейшых калгасна-соўгасных тэатраў Саюза паказала сябе з самага лепшага боку. Гэта сведчыць аб быстрым, правільным развіцці калгасна-соўгасных тэатраў у нашай рэспубліцы.

Аднак, было-б шкоднейшай памылкай для заслаўцаў «пачыць на лаўрах» і зазнацца. Трэба ім памятаць, што яны авалодалі толькі першымі асновамі велізарнай скарбніцы сусветнай тэатральнай культуры. Яны павінны ставіць перад сабой усё новыя, усё больш цяжкія задачы, каб творча расці.

З наступленнем сезона заслаўцы будуць працаваць над класічным рэпертуарам: «Жаніцьба» Гогаля, «Прадзелкі Скапена» Мальера. Гэты рэпертуар з'явіцца стымулам да далейшага росту калектыва. Будзе прадаўжаць тэатр і сваю работу над беларускай совецкай драматургіяй. З 4-х беларускіх п'ес, пастаўленых тэатрам за час сваёй работы, дзве напісаны аўтарамі для гэтага тэатра, адна перароблена аўтарам спецыяльна для заслаўцаў. Гэту добрую традыцыю тэатр абавязан прадаўжаць і ў далейшым, працуючы ў новым сезоне з драматургамі над узбагачэннем беларускай драматургіі.

Тэатр уключыў у рэпертуар камедыю К. Крапівы «Хто смяецца апошнім». Праведзена ўжо вялікая работа з выканаўцамі над новай пастаноўкай. Зацверджан макет афармлення, прадстаўлены мастаком Марыксам.

Цікавы і рознастайны рэпертуар намечан і ў іншых калгасна-соўгасных тэатрах. Рагачоўскі тэатр напярэдадні летняга водпуску паказаў прэм'еру «Пагібель воўка» Э. Самуйлёнка. Калектыў значна вырас на гэтай рабоце. Пастаноўшчык Ю. Рэшымаў стварыў удалы скарочаны варыянт п'есы Самуйлёнка, зрабіўшы магчымым пастаноўку гэтай выдатнай п'есы абмежаваным саставам актораў калгасна-соўгасных тэатраў. Пасля водпуску тэатр прыступіць да работы над антыфашысцкай п'есай Гергеля і Літоўскага «Мой сын». Тэатр мяркуе працаваць над такімі п'есамі з класічнага рэпертуара, як «Коварство и любовь» Шылера, «Власть тьмы» Льва Талстога. Тэатру трэба, працуючы над класічнымі п'есамі, памятаць аб няўдалым вопыце сваёй работы над «Егором Булычевым» і «Дурой для других, умной для себя», справядліва раскрытыкаваных на ўсебеларускім фестывалі. Тараплівасць, неахайнасць, хылетанства—ворагі мастацтва. З велізарнай настойлівасцю, удумліва і добрасумленна, аддаючы ўсяго сябе,—толькі так працуючы, можна дабіцца поспеху. Добры калектыў Рагачоўскага тэатра можа і павінен паказаць у новым сезоне цікавыя, добрыя спектаклі.

Над п'есай «Салавей» беларускага пісьменніка-ордэнаносца З. Бядулі працуе Слуцкі калгасна-соўгасны тэатр. З класічных п'ес тэатр уключыў у рэпертуар «Забавный случай» К. Гальдоні і «Не все кэту масленница» А. Н. Остроўскага. У новым сезоне тэатр ажыццёвіць пастаноўку 2-х новых лепшых совецкіх п'ес рускай драматургіі.

Полацкі калгасна-соўгасны тэатр знаходзіўся ў далёка нядобрым стане. Зараз становішча ў тэатры значна зменьваецца к лепшаму, мастацкае кіраўніцтва ўзяў на сябе вопытны рэжысёр тав. Кавязін. Тэатр звязан з беларускім пісьменнікам Я. Маўрам, які піша для тэатра п'есу «Памылка». Тэатр пачаў работу над п'есай Остраўскага «Не все коту масленница» і па звароце з водпуску пакажа яе гледачу. У новым сезоне тэатр мяркуе паставіць п'есы: «Хто смяецца апошнім» Крапівы, «Любоў Яравую» Трэнева, «Горькую судьбину» Пісемскага і падрыхтаваць вечар аднаактных п'ес.

Над п'есай Крапівы будзе таксама працаваць Бабруйскі тэатр. Пастаноўшчык— актор тэатра, які ўпершыню атрымаў самастойную рэжысёрскую работу, т. Офштэйн. Рэжысёр Ю. Рэшымаў будзе ставіць у тэатры малавядомую ў нас камедыю К. Гальдоні «Рыбакі».

Такавы рэпертуарныя намёткі на новы сезон. Апрача вельмі цікавых заявак на класіку, план цікавы тым, што ўсе тэатры ў гэтым сезоне будуць працаваць над беларускімі п'есамі.

Велізарнай важнасці работа, якая павінна быць у наступіўшым сезоне па-сапраўднаму разгорнута ў нашых калгасных тэатрах, — гэта вучэба акторскага калектыва. Дзе няма пладатворнай вучэбнай работы, там не можа быць правільнага росту маладых акторскіх калектываў. З асаблівай вастрынёй гэта задача стаіць перад Заслаўскім, Рагачоўскім, Лепельскім, а таксама і перад усімі астатнімі тэатрамі.

Многа прадстаіць арганізацыйнай работы ў тэатрах, каб забяспечыць пладатворны сезон. Ва ўсіх калгасных тэатрах нехапае акторскіх кадраў. Трэба папоўніць трупы як таленавітымі ўдзельнікамі мастацкай самадзейнасці, так і прафесіянальнымі акторамі. Толькі Слуцкі і Рагачоўскі тэатры сумелі да новага сезона ўзбагаціць саставы. Астатнім у гэтым неабходна дапамагчы. Астаўся без мастацкага кіраўніка Бабруйскі тэатр. Добрых бытавых умоў не створана для калектыва ў Заслаўлі. Мясцовыя партыйныя і совецкія органы мала лічацца з патрэбамі тэатра.

Па-ранейшаму ў непрацаздольным становішчы знаходзіцца Лепельскі тэатр. Назначаному нядаўна новаму мастацкаму кіраўніку прадстаіць прарабіць велізарную работу па выхаванню акторскага калектыва. Састаў тэатра павінен быць умацован прафесіянальнымі акторамі. Віцебскі абласны аддзел па справах мастацтва абавязан аказаць дзелавую дапамогу тэатру.

У новым годзе расшыраецца сетка калгасных тэатраў і сфера абслугоўвання гледачоў. Зараз ідзе камплектаванне состава ў нова арганізуемы Рэчыцкі калгасна-соўгасны тэатр. Два калгасныя тэатры БССР к пачатку 1940 г. будуць расшыраны, акторскі састаў будзе даведзен да 30 чалавек, што дасць магчымасць выязджаць на гастролі двума брыгадамі.

Умацоўваецца далей матэрыяльная база калгасных тэатраў. У новым годзе павялічваецца пастановачны фонд, расходы на вучобу, на спецвопратку і інш. Павінна быць дасягнута значнае паляпшэнне матэрыяльна-бытавых умоў работнікаў тэатраў. Намечана правядзенне ў 1940 г. семінараў для павышэння кваліфікацыі кіруючага состава калгасных тэатраў. У сярэдзіне 1940 г. адбудзецца першы выпуск палутарагадовых курсаў па выхаванню актораў для калгасных тэатраў. Мы атрымаем мощнае папаўненне для ўсіх калгасных тэатраў, а таксама кадры для арганізацыі 2-х новых калгасных тэатраў у 1940 г. (адзін у Оршы, другі ў Палескай вобласці).

Калгасныя тэатры карыстаюцца вялікай любоўю ў калгаснага гледача; яны нясуць у масы вялікія ідэі комунізма, садзейнічаюць культурнаму росту калгаснікаў. Вялікі пачот — работа ў такім тэатры.

Велізарныя клопаты і ўвага партыі і ўрада да гэтых тэатраў забяспечвае быстры рост, творчае ўзбагачэнне тэатраў з года ў год. Надыходзячы тэатральны год абяцае быць асабліва цікавым і пладатворным. Але для гэтага трэба добра папрацаваць як тым, хто знаходзіцца ў нашых калгасных тэатрах, так і тым, хто кіруе іх работай — абласным аддзелам па справах мастацтваў і Ўпраўленню па справах мастацтваў пры СНК БССР.

Умацаванне ўвагі да патрэб тэатраў з боку мясцовых, раённых арганізацый, — другая неабходная ўмова паспяховай работы калгасных тэатраў.

М. ЛЬВОЎ.

БЕЛАРУСКІ ПОЛІТЭХНІЧНЫ ІНСТЫТУТ НА ЎЗДЫМЕ

Беларускі політэхнічны інстытут з'яўляецца дзецішчам Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі. Першымі студэнтамі інстытута былі камандзіраваныя ад розных арганізацый рабочыя і сяляне, якія пасля ліквідацыі франтоў замянілі вінтоўкі на кнігі.

На працягу невялікага перыяда інстытут быў раздзелен на рад галінных інстытутаў. У 1933 годзе па пастанове СНК БССР гэтыя галінныя інстытуты — энергетычны, будаўнічы, тарфяны, воднамеліярацыйны, хіміка-тэхналагічны і харчовай прамысловасці былі зноў аб'еднаны ў адзіны Беларускі політэхнічны інстытут.

Індустрыялізацыя краіны на працягу 2-х сталінскіх пяцігодак, занава створаная магутная прамысловасць, яе праектныя арганізацыі, яе новыя цэхі, яе лабараторыі патрабавалі соцень тысяч інжынераў высокай кваліфікацыі і прытым сваіх, сапраўды совецкай фармацыі.

За час свайго існавання політэхнічны інстытут выпусціў 1.149 спецыялістаў. З іх — 120 інжынераў-механікаў, 363 інжынеры-будаўнікі па прамысловаму і грамадзянскаму будаўніцтву, 117 інжынераў-будаўнікоў па ацяпленню і вентыляцыі, 22 інжынеры-будаўнікі па водаснабжэнню і каналізацыі, 128 інжынераў-хімікаў па тэхналогіі сілікатаў, 124 інжынеры-хімікі па тэхналогіі брадзільнай вытворчасці, 35 інжынераў-хімікаў па тэхналогіі папяровай вытворчасці, 135 горных інжынераў па распрацоўцы тарфяных залежаў, 69 інжынераў-гідратэхнікаў і 36 інжынераў энергетыкаў.

Пітомцы інстытута працуюць на вялікай і адказнай партыйнай, гаспадарчай і навуковай рабоце. З выхаванцаў інстытута можна назваць наркома комунальнай гаспадаркі т. Забела, старшыню Дзяржплана т. Чорнага, інструктара ЦК КП(б)Б т. Хацько, галоўнага інжынера Асінторфа т. Парэмскага, начальніка Белводгаса т. Раяк, галоўнага інжынера Белтэрфа т. Фрадкіна, старшага навуковага работніка Акадэміі навук т. Кадача і інш.

Падрыхтоўка ўлічвала, што совецкі інжынер павінен быць не толькі тэхнічна пісьменным спецыялістам, але і мець салідны для камандзіра ідэйна-тэарэтычны багаж, быць палітычна зрэлым і ўладаць высокай рэвалюцыйнай пільнасцю.

У арганізацыі і правядзенні палітыка-выхаваўчай работы сярод студэнтаў і прафесарска-выкладчыцкага персанала выключнае значэнне маюць пастанова ЦК ВКП(б) аб пастаноўцы партыйнай прапаганды і выдатны твор марксізма-ленінізма «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)». Гэтыя гістарычныя дакументы ляглі ў аснову карэннай перабудовы ўсёй работы інстытута.

Значныя поспехі дасягнуты інстытутам у пастаноўцы вучэбнага працэса і ўмацаванні дысцыпліны. Выдатныя і добрыя ацэнкі паспяховасці за 1938-39 вучэбны год складаюць звыш 55 процантаў усіх ацэнак, атрыманых студэнтамі.

«Ва ўсякай школе самае важнае — ідэйна-палітычны напрамак лекцый. Чым вызначаецца гэты напрамак? Цалкам і выключна **саставам лектараў.**» (З пісьма В. І. Леніна вучням Капрыйскай партыйнай школы).

Гэтыя заветныя словы В. І. Леніна прымушалі інстытут сістэматычна змагацца за якасны састаў навукова-педагагічных і кіруючых кадраў, за іх высокую кваліфікацыю, за іх ідэалагічную загартаванасць.

Прафесарска-выкладчыцкі састаў Беларускага політэхнічнага інстытута складаецца з 18 прафесараў, з іх 3 маюць ступені доктараў навукі; 72 дацэнтаў, з іх 26 маюць ступені кандыдатаў навук і 80 асістэнтаў і выкладчыкаў.

Гэты навуковы калектыў разгарнуў у апошнія годы вялікую навукова-даследчую работу, накіраваную на вырашэнне праблемных навукова-тэарэтычных пытанняў, на абагульненне вопыту совецкай і замежнай тэхнікі, на распрацоўку праектаў новых машын, механізмаў, канструкцый і т. д.

На працягу апошніх год з друку выйшаў рад навуковых работ супрацоўнікаў інстытута ў выглядзе асобных манаграфій або зборнікаў навуковых прац інстытута, прычым тэматыка ў большасці актуальная, звязаная з пытаннямі ўздыму прамысловасці. Зараз знаходзіцца ў друку юбілейны зборнік навуковых прац інстытута.

Лозунг таварыша Сталіна: «Будучае навукі належыць моладзі ад навукі» — стаў шырока ажыццяўляцца ў рабоце інстытута.

З агульнай колькасці 30 кафедр 13 атрымалі права рыхтаваць аспірантаў. 20 маладых інжынераў праходзяць курс аспірантуры па розных спецыяльнасцях, 18 маладых навуковых работнікаў рыхтуюцца здаць аспіранцкі мінімум, 12 рыхтуюць кандыдацкія дысертацыі.

Студэнты старшых курсаў прыцягваюцца да даследчай работы, у іх выхоўваецца творчая ініцыятыва, самастойнасць мыслення, навыкі навуковага даследвання, смеласць эксперымента, дзярзанне і цярпенне пры правядзенні вопытаў.

Для вучэбнай і навуковай работы створана ў інстытуце вельмі салідная база: 18 добра абсталяваных лабараторый, 12 кабінетаў, спецыяльныя майстэрні і т. д., прычым абсталяванне ў іх навейшае—совецкае і імпартнае. Бібліятэка інстытута мае 100.000 кніг, у ёй ёсць апошнія тэхнічныя навінкі, замежныя тэхнічныя журналы і кнігі і т. п.

Вялікую ўвагу аддае інстытут, асабліва ў апошнія годы, масава-выхаваўчай рабоце, культурнай арганізацыі адпачынку студэнтаў, арганізацыі спорта. Сістэматычная трэніроўка па асобных відах фізічнай культуры, здачы норм ГПА і інш., валейбол, баскетбол, вылазкі на лыжах, розныя спаборніцтвы — з'яўляюцца неад'емнай часткай вучэбна-вытворчага працэса, часткай сістэмы выхавання фізічна загартаваных інжынераў, гатовых, калі спатрэбіцца, абараняць свяшчэнную зямлю соцыялізма ад ворагаў.

Пастановай СНК БССР інстытуту адпушчаны спецыяльныя сродкі на пабудову фізкультурнага павільёна.

Беларускі політэхнічны інстытут — адна з буйнейшых вышэйшых навучальных устаноў Совецкага Саюза. Калектыў інстытута, як і ўсе ВНУ краіны, штодзённа адчувае ўвагу і клопаты партыі і ўрада аб вышэйшай школе. Калектыў памятае, што толькі совецкая ўлада і ленінска-сталінская нацыянальная палітыка, толькі сталінскія клопаты дапамаглі вырасціць магутны індустрыяльны інстытут з 2.000 студэнтаў і 200 навуковых работнікаў.

Калектыў Беларускага політэхнічнага інстытута, узброены мудрымі рашэннямі XVIII з'езда ВКП(б), будзе і надалей ісці ўперад, рыхтуючы нашай соцыялістычнай прамысловасці сотні і тысячы высокакваліфікаваных спецыялістаў, беззаветна адданых вялікай справе Леніна—Сталіна.

Дацэнт С. ГРАДЗЗОЎСКІ, намеснік дырэктара па вучэбна-навуковай частцы.

АРГАНІЗУЕМ СТАХАНАЎСКІЯ ШКОЛЫ

Вось ужо 8 год як я працую на швейнай фабрыцы імені Крупскай. Тут я атрымала кваліфікацыю матарысткі. Памятаю, як упершыню прышла ў цэх. Бесперапынны шум матораў аглушаў мяне. Я баязліва аглядалася навокал. Не ведала нават, як іголку ў руках трымаць. Далі мне шыць абрэзкі. Практыкавалася на гэтым «працэсе» некалькі дзён, а потым азнаёмілася з машынай.

Паступова я пераходзіла ад простых аперацый да больш складаных. Смялейшай стала. Побач са мной сядзелі старыя работніцы. Я ўсё прыглядалася да іх работы. У іх руках мільгацела беласнежнае палатно. Быстрымі, ледзь улавімымі рухамі яны пратаралі асобныя раскроеныя дэталі ў рукавы, у цэлыя рубашкі.

Як яны так быстра працуюць? У мяне дык машына часта псавалася, не магла як след развярнуцца. У часе перапынку суседкі ўсё навучалі: перш за ўсё даглядаць добра машыну, і тады яна будзе шыць бясспынна. Яны паказвалі, як лепш трымаць рубаху ў руках, каб лішніх рухаў не рабіць. Я сур'ёзна адносілася да іх парад. З кожным днём поспехі мае павялічваліся. Заданне ў мяне было 470 адзінак, а прапускала 650—700. Заслужыла пачотнае званне стаханаўкі.

У пачатку гэтага года начальнік цэха прымацаваў да мяне адну новую работніцу. З ахвотай я ўзяла над ёй шэфства. Пасля работы мы ўсаджваліся ля свабоднай машыны. Некалькі раз паказвала, як педалі націскаць, чаўнок даставаць, лапкі апускаць. Праштудыравала з ёй, што называецца, самыя азы.

Праз тыдзень вучаніца мая атрымала самастойную работу. У першы дзень яна пашыла 7 рубах. Яна быстра ўсё ўспрымала і набліжалася да выканання нормы.

Прайшло некалькі месяцаў. За гэты час я абучыла трох работніц. Усе яны сталі стаханаўкамі, перавыконваюць свае нормы. Я вельмі рада іх поспехам. Стаханаўцы не толькі павінны самі працаваць добра, але і дапамагаць астатнім работніцам падцягнуцца да ўзроўню перадавікоў.

Шэфства стаханаўцаў над адсталымі работніцамі, над навічкамі практыкуецца ва ўсіх цэхах. Але найлепшым спосабам перадачы вопыту з'яўляюцца стаханаўскія школы. На нашым прадпрыемстве іх пакуль што няма. А яны-ж могуць ва многім садзейнічаць далейшаму павышэнню прадукцыйнасці працы, росту стаханаўскіх радоў.

Я сама з вялікім задавальненнем буду займацца з групай работніц, перадаваць ім свой вопыт, свае веды. Кіраваць стаханаўскімі школамі могуць таксама нашы вядомыя стаханаўкі Брамброт, Шавейка і іншыя. Нам, безумоўна, патрэбна будзе дапамога тэхнолагаў, майстраў.

Кіраўнікам фабрыкі трэба праявіць больш ініцыятывы ў гэтых адносінах. Арганізацыя стаханаўскіх школ з'яўляецца найважнейшай справай для ўсяго калектыва нашай фабрыкі.

Э. Ф. АНІСОВІЧ, стаханаўка мінскай швейнай фабрыкі імені Крупскай.

ГЕРМАНА-ПОЛЬСКАЯ ВАЙНА

БЕРЛІН, 15 верасня. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі апублікавала сёння раніцой аператыўную зводку, у якой гаворыцца:

«14 верасня германскія войскі, якія оперыруюць на поўдні Польшчы, перасекі дарогу Люблін—Львоў.

Буйныя злучэнні германскіх войск сканцэнтрыраваны ў раёне Кутно. Спробы акружаных у Кутно польскіх войск прарвацца скрозь кальцо германскіх войск і вырвацца на паўднёвы ўсход адбіты.

Войскі, якія прасоўваюцца з паўночнага ўсхода і паўднёвага ўсхода па напрамку да Варшавы, дасягнулі прадмесця польскай сталіцы — Прагі. Германскія войскі адбілі атаку праціўніка, які прабаваў прарвацца на ўсход.

Германскія войскі, якія наступаюць на крэпасць Брэст—Літоўск, праніклі з поўначы ў зону ўмацаванняў. Фарты крэпасці часткова ўзарваны. Цэнтральная частка крэпасці знаходзіцца яшчэ ў руках польскіх войск».

***

Горад Гдыня занят германскімі войскамі. Германскія ваенна-марскія сілы паспяхова ўдзельнічалі ў баях за Гдыню і за поўвостраў Хела.

Германская авіяцыя на працягу ўсяго дня 14 верасня бамбардыравала лініі чыгункі і чыгуначныя станцыі, а таксама прыняла ўдзел у наземных баях у раёне Кутно.

У рэзультаце бамбардыроўкі патоплены польскія ваенныя караблі, якія знаходзіліся ў парту Ястраня (паўвостраў Хела).

ДЗЕЯННІ ГЕРМАНСКАЙ АВІЯЦЫІ

БЕРЛІН, 15 верасня. (ТАСС). Як паведамляе германскае інфармацыйнае бюро, германская авіяцыя 13 верасня бамбардыравала чыгункі Волкавыск—Чэрэмха, Пулавы—Люблін, Ковель—Люблін—Львоў. Рух па гэтых лініях чыгункі парушан. Вакзалы ў Ковелі, Седлецы і Лукаве разбураны.

Германскія транспартныя самалёты забяспечылі прасунуўшыяся да Калушына бронетанкавыя часці снарадамі і амуніцыяй.

Дзеянні польскай авіяцыі і зенітнай артылерыі надзвычай слабыя. Не гледзячы на тое, што германскія самалёты часамі дзейнічалі на невялікай вышыні — каля 400 метраў, яны не сустракалі супраціўлення польскіх знішчальнікаў.

ПАРЫЖ, 15 верасня. (ТАСС). У камюніке генеральнага штаба польскай арміі, пераданым па радыё агенцтвам Гавас, гаворыцца:

«Германская авіяцыя падвергла бамбардыроўцы на ўсходзе Польшчы гарады Дубно, Владзімір-Валынскі, Радзівілаў. У раёне Рава Руска польскія самалёты бамбардыравалі германскія бронетанкавыя часці. Збіты 2 германскія самалёты.

На поўначы Польшчы германскія войскі, выступіўшыя з Усходняй Прусіі, наступаюць у напрамку Сувалак.

Праціўнік заўважан у ваколіцах Беластока і Бельска. Польскія войскі ўмацаваліся на заходняй украіне Белавежскай пушчы.

У раёне Калушын—Лукаў прадаўжаюцца жорсткія баі. Знішчаны германская бронетанкавая калона і пяхотны полк.

У цэнтры Польшчы ў раёне Скерневіцэ—Ловіч баі прадаўжаюцца.

У раёне Ополе (на паўднёвы захад ад Любліна) прадаўжаюцца баі супроць германскіх часцей, якія перайшлі Віслу.

На поўдні Польшчы германскія бронетанкавыя часці дасягнулі Замосця».

Адначасова агенцтва Гавас паведамляе, што Львоў падвергся ўчэра ўзмоцненай бамбардыроўцы германскай цяжкай артылерыі. Наступленне германскіх войск у раёне Львова адбіта. Германскімі войскамі кінута 10 танкаў, 1 браніраваны аўтамабіль і 11 матацыклаў. Збіта некалькі самалётаў праціўніка.

У прадмесцях Варшавы адбываліся сутычкі патрулёў. Польскія войскі адбілі атакі праціўніка ў прадмесці польскай сталіцы — Воля.

***

ПРАГА, 15 верасня. (ТАСС). Як паведамляе газета «Словенска політыка», польскія войскі, якія адступаюць на паўднёвы захад, узарвалі 23 масты, разбурылі 2 тунэлі, 4 станцыі чыгункі, 6 кілометраў чыгуначных пуцей і 29 кілометраў шасейных дарог.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ГЕРМАНСКАГА ІНФАРМАЦЫЙНАГА БЮРО

БЕРЛІН, 15 верасня. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што ў бліжэйшы час аднавяцца чыгуначныя зносіны паміж Данцыгам і Усходняй Прусіяй і паміж Усходняй Прусіяй і астатняй Германіяй. Прыняты таксама меры для аднаўлення чыгуначных зносін на лініях Тчэў—Быдгошч і Быдгошч—Шнейдэмюль.

АМЕРЫКАНСКІ ДРУК АБ СТАНОВІШЧЫ НА ПОЛЬСКІМ ФРОНЦЕ

НЬЮ-ЁРК, 15 верасня. (ТАСС). Агенцтва Асошыэйтэд Прэс паведамляе, што польскія войскі адступаюць ва ўсходнім напрамку. Адрывістыя паведамленні з Львова сведчаць аб тым, што германскія войскі прарвалі польскі фронт у Вышкуве, Дэнбліне, Красніку і ў раёне на захад ад Львова. Львоў падвяргаўся неаднаразовым паветраным бамбардыроўкам. Разбуран вадаправод. Поўмільённае насельніцтва снабжаецца валой з дапамогай ручных помпаў. На многіх вуліцах успыхнулі пажары. Германскімі самалётамі разбураны чыгуначныя лініі. Мноства бежанцаў, якія накіроўваюцца ў Румынію, перашкаджаюць ваенным перавозкам.

Па паведамленню агенцтва Юнайтэд Прэс з Бухарэста, 12 верасня ўвесь дзень Львоў падвяргаўся паветранай бамбардыроўцы. Сувязь з горадам перарвана. Мяркуюць, што пачнецца наступленне германскіх войск на Львоў.

Агенцтва Асошыэйтэд Прэс адзначае, што некаторыя палякі абвінавачваюць сваіх кіраўнікоў у тым, што яны многа разгаварваюць і мала робяць.

Палякі спадзяюцца, што хутка пачнецца перыяд дажджоў, які затрымае германскае наступленне, аднак ваенныя аглядальнікі ўскладаюць на гэта мала надзей, паколькі з дня ў дзень пагаршаецца сістэма снабжэння польскай арміі. Германскія самалёты паралізуюць работу транспарта.

Англійскія і французскія ваенныя місіі ў Польшчы бесперапынна пераязджаюць з месца на месца. Германская разведка быстра выяўляе іх месцазнаходжанне і падвяргае абстрэлу з паветра адразу-ж пасля іх пераезду на новае месца.

***

НЬЮ-ЁРК, 15 верасня. (ТАСС). Карэспандэнт газеты «Нью-Ёрк геральд трыбюн», які суправаджаў германскую армію на ўсход да Лодзі, апісвае свае ўражанні аб германскім наступленні ў Польшчы. «Рады польскіх сялянскіх хат прадстаўляюць сабой палаючыя руіны. Мы не бачылі прызнакаў арганізаванага польскага супраціўлення наступленню германскіх войск, якое, відавочна, было дэтальна распрацавана. Замест траншэй і бетаніраваных кулямётных гнёзд мы назіралі адчаяную барацьбу ў польскіх дамах. Гарады і вёскі, а таксама цэлыя раёны ператвораны ў груды палаючых руін. Уладальнікі дамоў блукаюць па дарогах ва ўсіх напрамках. На ўсім шляху ад Серадза і Лодзі і адтуль на поўдзень да Радамска і на ўсход ад Кракава да германскай граніцы мы не бачылі ні аднаго непашкоджанага горада ці вёскі, за выключэннем Лодзі. Ва многіх гарадах звыш палавіны будынкаў разбурана. Толькі Лодзь была захвачана без бою. З хмурымі тварамі глядзіць польскае насельніцтва на ўсе гэтыя разбурэнні. Германскія салдаты заяўляюць, што іх злейшымі ворагамі з'яўляюцца грамадзянскія снайперы. Пасля наступлення змяркання германскія салдаты апасаюцца выходзіць за лінію фронта. Салдаты папярэджаюць, што многія снайперы з'яўляюцца салдатамі польскай арміі, якія аддзяліліся ад сваіх часцей».

ЗАЯВА БРАУДЭРА

НЬЮ-ЁРК, 15 верасня. (ТАСС). Газета «Дэйлі уэркер» публікуе інтэрв'ю з генеральным сакратаром ЦК амерыканскай кампартыі Браудэрам. Закранаючы вайну ў Еўропе, Браудэр ахарактарызаваў яе як «імперыялістычную вайну, у якой кіраўнікі абодвух бакоў у роўнай меры вінаўны. Гэта вайна вядзецца не ў мэтах знішчання фашызма, а ў мэтах расшырэння імперыялістычнага панавання над светам. Характар гэтай вайны прынцыпова нічым не адрозніваецца ад апошняй сусветнай вайны, і яна нічэга не дасць масам апрача смерці, разбурэння і павелічэння бядот». Польшча, указаў Браудэр, таксама, як і Бельгія ў апошняй сусветнай вайне, скарыстана як прадлог для гэтай вайны.

Закрануўшы далей палітыку ЗША, Браудэр выказаўся за перагляд закона аб нейтралітэце. Перагляд закона аб нейтралітэце, указаў Браудэр, можа садзейнічаць узмацненню пазіцыі ЗША, як сілы, накіраванай да абмежавання вайны.

НА ФРАНТАХ У КІТАІ

У ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ

За апошні час зноў разгарнуліся баі ў паўднёва-ўсходняй частцы правінцыі Шаньсі, асабліва каля гэрада Чжанцзы.

У паўднёвай частцы правінцыі Хэбэй кітайцы ўварваліся ў Сіньхе і разграмілі японскі атрад, які страціў 60 чал. забітымі. Кітайцы захвацілі ў палон 13 чыноўнікаў мясцовага марыянетачнага ўпраўлення. 9 верасня кітайцы акружылі Дамін.

У ПАЎДНЁВЫМ КІТАІ

Прадаўжаюцца баі на поўнач ад Сватоу. Асобныя пункты ў гэтым сектары пераходзяць з рук у рукі. На паўночны ўсход ад Кантэна не спыняюцца баі ў раёне Цунхуа. Японцы прадаўжаюць высаджваць дэсанты на поўдзень ад Кантона. Кітайскія войскі і мясцовыя добраахвотніцкія атрады аказваюць японцам упорнае супраціўленне.

РАСПАРАДЖЭННЕ ФРАНКО

НЬЮ-ЁРК, 14 верасня. (ТАСС). Па паведамленню карэспандэнта газеты «Нью-Ёрк таймс» з Сан-Себасцьяна, Франко забараніў усім іспанскім суднам весці гандаль з ваюючымі краінамі. За прайшоўшы год Германія займала пануючае месца (50 процантаў) у гандлі з Іспаніяй, аднак, англійская блакада канчаткова падарвала германа-іспанскі гандаль. З моманту ўзнікнення вайны ў Еўропе Іспанія пачала праяўляць вялікі інтарэс да гандлю са Злучанымі Штатамі Амерыкі. Урад Франко ўжо заказаў у ЗША 2.500 грузавікоў.

МАНЕЎРЫ АМЕРЫКАНСКАГА ЦІХААКІЯНСКАГА ФЛОТА

НЬЮ-ЁРК, 14 верасня. (ТАСС). Па паведамленню газеты «Нью-Ёрк таймс», ціхаакіянскі флот ЗША у саставе 130 ваенных караблёў, а таксама 450 самалётаў сканцэнтрыраван у сучасны момант у ваенна-марской базе ў Сан-Педро (штат Каліфорнія) для ўдзелу ў манеўрах, якія назначаны на 23 верасня. Манеўры працягнуцца 5 дзён. «Некаторыя аглядальнікі, — піша газета, — указваюць, што вайна ў Еўропе яшчэ больш узмацніла неабходнасць канцэнтрацыі амерыканскага флота ў Ціхім акіяне».

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ ПАМІЖ ГЕРМАНІЯЙ І ФРАНЦЫЯЙ

ПАРЫЖ, 15 верасня. (ТАСС). Агенцтва Гавас перадае сённешняе французскае камюніке аб ваенных дзеяннях на заходнім фронце. У камюніке гаворыцца: «Аперацыі апошніх дзён дазволілі нам умацавацца ў раёне на паўночны ўсход ад горада Зірк. Акрамя таго, мы прасунуліся далей гэтай мясцовасці. За ноч адбылося мясцовае паляпшэнне нашых перадавых пазіцый, не гледзячы на моцнае процідзеянне артылерыі праціўніка».

***

ПАРЫЖ, 15 верасня. (ТАСС). У афіцыяльным камюніке, выпушчаным учора, паведамляецца, што французскія войскі на заходнім фронце «правялі мясцовыя перасоўванні, у часе якіх захвацілі палонных».

***

БЕРЛІН, 15 верасня. (ТАСС). Агенцтва Трансоцэан паведамляе, што ў апублікаванай сёння зводцы германскага вярхоўнага камандавання адзначаецца актыўнасць французскай артылерыі на заходнім фронце ў раёне Саарбрукена. Наступленне праціўніка на Швейц (пагранічная станцыя на поўдні ад Цырмавенс) было адбіта агнём германскай артылерыі. Налётаў непрыяцельскай авіяцыі на германскую тэрыторыю за гэты час не адбывалася.

***

ЛОНДАН, 15 верасня. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр, спасылаючыся на паведамленне брусельскага карэспандэнта, перадае, што ўчора пасля поўдня французскія войскі пачалі наступленне блізка ад Перль у раёне Мозеля. Назіральнікі, якія знаходзіліся на тэрыторыі Люксембурга, бачылі, як пасля сільнай артылерыйскай падрыхтоўкі ішлі ў бой французскія танкі. Германскія пасты вымушаны былі адыйсці. Сапёрныя часці ўзарвалі чыгуначную лінію з тым, каб затрымаць французскае наступленне. Улады Люксембурга аддалі распараджэнне аб эвакуацыі насельніцтва з пункта Шэнген (паўднёвая частка Люксембурга).

Агенцтва Рэйтэр, спасылаючыся на свайго парыжскага карэспандэнта, перадае, што, па думцы назіральнікаў у Парыжы, французскае прасоўванне нарушыла планы германскага генеральнага штаба. Не гледзячы на дрэннае надвор'е, якое перашкаджае паветраным аперацыям, французы прадаўжаюць прасоўванне ў раёне Саарбрукена.

Газета «Пці паріз'ен» паведамляе, што германская артылерыя, як відаць з апасення шырокага наступлення, 36 гадзін падтрымлівала агнявую завесу. Артылерыйская бамбардыроўка мела галоўным аб'ектам дарогі за лініяй французскіх пагранічных вышынь на поўдзень ад Саарбрукена.

Сутычка германскага і галандскага самалётаў

БЕРЛІН, 15 верасня. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што 13 верасня ў 10 марскіх мілях ад вострава Амеланда, г. зн. па-за галандскімі водамі, германскі разведвальны самалёт сустрэў машыну, дзяржаўную прыналежнасць якой нельга было вызначыць. Невядомы самалёт раптоўна павярнуў на германскую разведвальную машыну, якая адкрыла па ім агонь. Абстрэлены самалёт апусціўся на мора і апракінуўся. Пры яго спуску германскі экіпаж змог вызначыць, што гэта быў галандскі самалёт «Фоккер». Германскія лётчыкі ў той-жа момант спусціліся на ваду. Экіпаж галандскага самалёта, які складаўся з 4 чалавек, з якіх 2 былі лёгка ранены, быў прынят на борт германскага самалёта і дастаўлен у германскі порт.

Галандскія лётчыкі, гаворыцца ў паведамленні, прызнаюць, што сутычка з германскім самалётам адбылася з-за іх неасцярожнасці.

РАШЭННІ, ПРАДЫКТАВАНЫЯ ІНТАРЭСАМІ НАРОДА

Учора, у 3 гадзіны дня, у зале Вялікага тэатра оперы і балета адбыўся многалюдны сход калектыва тэатра разам з выбаршчыкамі 29 і 31 выбарчых участкаў г. Мінска, прысвечаны вынікам унечарговай IV Сесіі Вярхоўнага Савета СССР. Прысутнічала каля 750 чалавек.

Даклад аб рабоце Сесіі зрабіў дэпутат Вярхоўнага Савета СССР, нам. старшыні Савета Народных Камісараў БССР тав. В. Г. Ванееў.

Дакладчык падрабязна ахарактарызаваў законы, прынятыя Сесіяй, падкрэсліў, што яны поўнасцю накіраваны на яшчэ большае ўмацаванне абаронай магутнасці вялікай краіны сацыялізма. Тав. Ванееву было задана многа пытанняў, асабліва пікавіліся выбаршчыкі цяперашнім міжнародным становішчам у Еўропе.

У рэзалюцыі, прынятай аднагалосна, сход горача вітаў рашэнні Сесіі Вярхоўнага Савета СССР. Кожнае слова гэтых рашэнняў пранікнута мудрасцю партыі Леніна—Сталіна і савецкага ўрада, іх нястомнымі клопатамі аб правітанні сацыялістычнай радзімы, аб добрабыце вялікага савецкага народа.

Законы, прынятыя Сесіяй, — гаворыцца ў рэзалюцыі, — поўнасцю адпавядаюць інтарэсам мільёнаў працоўных нашай краіны. Закон аб усеагульным воінскім абавязку з'яўляецца залогам далейшага росту ваеннай магутнасці сацыялістычнай дзяржавы. Сход аднадушна вітаў непахісную ленінска-сталінскую мірную палітыку савецкага ўрада, якая грунтуецца на несакрушальнай сіле вялікага народа.

НА ЎСЕСАЮЗНАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫСТАЎЦЫ

ДАКЛАД ЗНАТНАГА ІЛЬНОЦЕРАБІЛЬШЧЫКА

Адзін з лепшых ільноцерабільшчыкаў Савецкага Саюза — удзельнік выстаўкі Анатолій Петроў выступіў 14 верасня ў вялікім кінатэатры з дакладам аб вопыце сваёй работы.

У мінулым годзе, працуючы ў Ключэўскай МТС, Кіраўскай вобласці, ён выцерабіў за 20 дзён на ільноцерабілцы «ЛТ-7» 251,5 гектара. Тав. Петроў зарабіў за гэты час 3.700 рублёў, машына яго штодзенна замяняла ад 130 да 190 чалавек.

Зараз тав. Петроў намеснік начальніка Кіраўскага абласнога зямельнага ўпраўлення.

З расказам аб сваёй рабоце выступілі ўдзельнікі выстаўкі — старшыня калгаса «Прабуджэнне», Лукаўнікоўскага раёна. Калінінскай вобласці, тав. Алексееў і знатны ільнавод Наталья Кукліна з калгаса «Культиватор», Шарангскага раёна, Кіраўскай вобласці.

НОВЫ ПАРАДАК ЭКСКУРСІЙНАЙ РАБОТЫ

Сотні тысяч калгаснікаў пабывалі ўжо на Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы—у гэтай выдатнай школе перадавога стаханаўскага вопыту. З кожнай групай экскурсантаў прыбываюць знатныя паляводы, даяркі, заатэхнікі, гародаводы, аграномы. Да гэтага часу яны аглядалі выстаўку ўсе разам, цэлай групай, без адрознення спецыяльнасцей. Вопыт паказаў, што такі парадак прывядзіў толькі да агульнага азнаямлення з багаццямі выстаўкі і не даваў магчымасці экскурсантам адной якой-небудзь спецыяльнасці дастаткова глыбока вывучыць дасягненні перадавікоў сваёй галіны.

Зараз устаноўлен новы парадак экскурсійнай работы. З калгаснікаў-экскурсантаў, якія прыбываюць на выстаўку, ствараюцца спецыялізіраваныя групы — жывёлаводаў, паляводаў, бавоўнаробаў, трактарыстаў і т. д. Гэта дасць магчымасць экскурсантам, апрача агульнага азнаямлення з выстаўкай, некалькі дзён падрабязна вывучаць перадавы вопыт стаханаўцаў адпаведнай галіны сельскай гаспадаркі. (ТАСС).

Актывісткі масавай абаронай работы хатняя гаспадыні — члены групы самаабароны домаўпраўлення № 21 г. Магілева. Злева направа: П. А. ЛОРЧАНКА (начальнік групы самаабароны), Р. М. ГЕРШМАН (камандзір санітарнага звяна) і А. К. ЕРМАКОВІЧ (палітрук).
Фото А. Н. Розельмана (фотахроніка БЕЛТА).

ЮБІЛЕЙ ДРАМАТЫЧНАГА ГУРТКА

Драматычны калектыў клуба імені Казановіча (станцыя Віцебск) днямі адзначыў 15-годдзе свайго існавання. Гэты самадзейны калектыў карыстаецца шырокай папулярнасцю не толькі сярод чыгуначнікаў Віцебска, але і лінейных станцый. Ім пастаўлена за гэты час 390 спектакляў. Чыгуначнікі і члены іх сем'яў глядзелі спектаклі «Васа Жэлезнова» — Горкага, «Платэн Крэчэт» — Карнейчука, «Слава» — Гусева і т. д. У выкананні гурткоўцаў.

ПРЭМ'ЕРЫ КАГЛАСНА-СОЎГАСНЫХ ТЭАТРАЎ БССР

Калгасна-соўгасныя тэатры БССР рыхтуюцца да новага асенне-зімовага сезона. Маладыя тэатральныя калектывы паставяць рад п'ес класікаў. Полацкі тэатр ставіць спектакль «Не все коту масленица»—Остроўскага, Рагачоўскі—«Власть тьмы» — Талстога, Заслаўскі — «Женитьба» — Гогаля, Бабруйскі — «Рыбаки» — Гальдоні. У рэпертуары — новыя п'есы беларускіх савецкіх драматургаў «Хто смяецца апошнім» — Крапівы, «Пагібель воўка» — Самуйлёнка, новая п'еса Янкі Маура і інш., а таксама перакладныя п'есы рускіх савецкіх драматургаў.

Першым у бліжэйшыя дні адкрые сезон слуцкі калгасна-соўгасны тэатр, які падрыхтаваў прэм'еру «Салавей» — пісьменніка-ордэнаносца Бядулі.

МАЙСТРЫ МАСТАЦКАЙ ВЫШЫЎКІ ЕДУЦЬ НА ВЫСТАЎКУ

Майстры мастацкай вышыўкі і ткацтва, якія працавалі над афармленнем Беларускага павільёна на Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, зараз ткуць і вышываюць новыя мастацкія работы з адыходаў шоўкавай вытворчасці. Калгасніца сельскагаспадарчай арцелі «Перамога», Копыльскага раёна, Анна Якімаўна Семашка працуе над партрэтам таварыша Сталіна, па эскізу студэнта Маскоўскага інстытута мастацтва тав. Грынько. Калгасніца сельгасарцелі «Ільіч», Чырвонаслабодскага раёна, Аляксандра Нікіфараўна Мешачок выткала надзвычай цікавыя салфеткі, упрыгожаныя беларускім народным арнаментам.

Дом народнай творчасці БССР арганізуе экскурсію 20 лепшых беларускіх вышывальшчыц і ткачых на Ўсесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку. (БЕЛТА).

ПОЎМІЛЬЁНА РУБЛЁЎ ДАХОДУ АД ГАРОДНІНЫ

Сельскагаспадарчая арцель «Чырвоны агароднік», Мінскага раёна, з'яўляецца буйнейшай прыгараднай гаспадаркай, якая забяспечвае насельніцтва сталіцы БССР гароднінай. У бягучым годзе ў калгасе было пасаджана 50 гектараў гародніны — цыбуля, салата, агуркі, морква, капуста, памідоры і іншыя культуры, 50 гектараў бульбы, заложана 6 тысяч парніковых рам ранняй гародніны.

Калгас мае на крытым рынку два пастаянныя ларкі для рэалізацыі сваёй прадукцыі. У гэтым сезоне ім прадана ўжо 480 тон гародніны і 162 тоны бульбы; атрыман даход 560.263 рублі.

Чэсная работа калгаснікаў на агародах арцелі добра аплачваецца. Нядаўна ў калгасе былі выданы грашовыя авансы на працадні. Многія сем'і калгаснікаў атрымалі авансам па 1000—1500 руб. Сям'я калгасніка Іосіфа Чарняўскага, якая складаецца з двух працаздольных, атрымала авансам 1465 руб., сям'я калгасніка Пётры Іванавіча (3 працаздольныя) — 1470 руб., сям'я калгасніка Іосіфа Траянава (3 працаздольныя) — 1277 рублёў і т. д.

Калгаснікі жывуць заможна і культурна. Каля 40 сем'яў усяліліся ў новыя дамы. Калгаснік Васілій Чарняўскі заканчвае будаўніцтва новага дома з 3 пакояў.

Звыш 50 двароў поўнасцю электрыфіцыраваны і радыёфіцыраваны. 11 калгаснікаў у бягучым годзе набылі патэфоны, 14 чалавек маюць веласіпеды. Рад стахановцаў-калгаснікаў адпачывалі ў гэтым годзе ў мясцовых санаторыях.

Старшынёй гэтага калгаса — сапраўднай фабрыкі гародніны — з'яўляецца тав. Трушкевіч, узнагароджаны ўрадам Саюза ордэнам Леніна.

Абласная мастацкая выстаўка

МАГІЛЕЎ. Абласны Дом народнай творчасці арганізоўвае першую абласную мастацкую выстаўку. 43 майстры самадзейнага мастацтва ўжо выказалі згоду ўдзельнічаць у ёй. Сярод іх—мастакі, рэзчыкі па дрэву, скульптары, інкрустатары, вышывальшчыцы.

Работнік Горацкага клуба промкааперацыі тав. Пушкін рыхтуе ларэц чэканнай работы, на якім будуць аблюстраваны артыкулы Сталінскай Канстытуцыі аб праве на працу, на адпачынак, на адукацыю. Чэканка выконваецца на медзі. Навуковы работнік Горацкага сельскагаспадарчага інстытута тав. Кадрэвіч піша карціну «Таварыш Орджанікідзе ў разведцы пад Барысавам». Вядомы рэзчык-інструктар Якаў Сцяпанавіч Арлоў працуе над барэльефам «Ваенная прысяга» і т. д.

Выстаўка адкрыецца да XXII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэвалюцыі. Оргкамітэт Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР па Магілеўскай вобласці зацвердзіў выставачны камітэт. («Комунар Магілеўшчыны»).

ДЗЕННІК

Сёння, у 7 гадзін вечара, у вялікім зале Дома партактыва, аддзел Прапаганды і агітацыі Мінгаркома КП(б)Б і Палітаддзел 5-га аддзялення Заходняй чыгункі праводзяць лекцыю для партыйнага, комсамольскага актыва і інтэлігенцыі на тэму: «Асноўныя рысы марксісцкага дыялектычнага метада».

Лектар дацэнт т. Овандэр.

Білеты ў райкоме КП(б)Б і ў парткабінеце Палітаддзела чыгункі.

В. а. адказнага рэдактара
Т. С. ГАРБУНОЎ

ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА
17 верасня Абанемент № 106.
РУСАЛКА
18 верасня Абанемент № 107.
ДРЫГВА
Білеты ў Доме профсаюзаў з 12—5 г. дня; у дзень пастаноўкі — у касе тэатра з 6 г. веч.

ПЕРШЫ БЕЛАРУСКІ ДЯРЖАЎНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР
16 верасня Абанемент № 15.
ПАРТЫЗАНЫ
Пачатак роўна ў 7 г. 30 м. вечара.

Кінатэатр «Чырвоная зорка»
«ГОРНЫЙ МАРШ»

Кінатэатр «Родина»
ЧАПАЕЎ

Кінатэатр «СПАРТАК»
АЛЕКСАНДР НЕЎСКІ

Кінатэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ»
СВЯТА СВЯТОГА ЮРГЕНА

Дзіцячы кінатэатр
«ЭСКАДРИЛЬЯ № 5»

Кіно «Парыжская Комуна» (Пушкіна, 64)
«МУЖЕСТВО»

Кінатэатр «НАВІНЫ ДНЯ»
1. Журналы Маскоўскай студыі кінохронікі №№ 78 і 79.
2. Журнал Мінскай студыі кінохронікі № 42.
3. «Сказка о добром Умаре» (каляровая мультыплікацыя).

УПРАЎЛЕННЕ ДАМАМІ АДПАЧЫНКУ І САНАТОРЫЯЎ ВЦСПС ПА БССР
перамясцілася
НА ПЕРШАМАЙСКУЮ ВУЛІЦУ, 17 — ПАРК імені ГОРКАГА.
Тэл. 25-535.

Беларускім дзяржаўным юрыдычным інстытутам
пры НКЮ БССР
прадоўжан набор студэнтаў
НА 1939-40 ВУЧЭБНЫ ГОД.
Інстытут рыхтуе юрыстаў для работы ў органах суда, пракуратуры, следства, натарыята, адвакатуры і арбітража.
Прыём заяў аб паступленні ў інстытут адкрыт да 25 верасня.
Прыёмныя іспыты — з 25 верасня па 10 кастрычніка. Залічэнне — з 10 па 15 кастрычніка.
Маючыя атэстат выдатніка прымаюцца без экзаменаў.
Студэнты забяспечваюцца стыпендыяй, а іншагароднія — і інтэрнатам.
Падрабязнасці аб умовах прыёму можна атрымаць у юрыдычным інстытуце, пакой № 321, або па тэлефону 20-753.
Заявы пасылаць на імя дырэктара юрыдычнага інстытута па адрасу: гор. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, юрыдычны інстытут.
ДЫРЭКЦЫЯ ІНСТЫТУТА.

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ
ў беларускі калгасны сельска-гаспадарчы тэхнікум імені Леніна
НА 1940 ВУЧЭБНЫ ГОД
1. Калгасны сельскагаспадарчы тэхнікум рыхтуе кадры спецыялістаў сярэдняй кваліфікацыі для кіруючай работы ў калгасах, МТС і соўгасах.
2. У тэхнікум прымаюцца лепшыя старшыні калгасаў і сельсоветаў, брыгадзіры, звеннявыя, стаханаўцы калгасаў, МТС і соўгасаў, якія праявілі сябе на практычнай рабоце.
3. Усе навучаючыяся тэхнікума забяспечваюцца інтэрнатам і дзяржаўнай стыпендыяй у размеры 250 рублёў у месяц.
4. Скончыўшыя тэхнікум атрымліваюць пасведчанне тэхніка па сельскай гаспадарцы.
5. Прымаюцца асобы ва ўзросце ад 18 да 40 год з агульнаадукацыйнай падрыхтоўкай не ніжэй 4-х класаў пачатковай школы і вытрымаўшыя прыёмныя іспыты.
6. Прыём заяў аб залічэнні ў тэхнікум праводзіцца з 10 верасня па 10 лістапада г. г. Заявы падаюцца на імя дырэктара тэхнікума.
7. Да заявы павінны быць прыкладзены: а) камандыроўка і характарыстыка мясцовага раённага камітэта КП(б)Б (незалежна ад партыйнасці), а для ваеннаслужачых — Палітаддзела вайсковага злучэння, б) даведка аб асвеце, в) даведка аб стане здароўя, г) тры фотакарткі, д) копія дакумента аб адносінах да воінскага абавязку, е) уласнаручна напісаная аўтабіяграфія, ж) завераная ў райкоме КП(б)Б анкета, з) даведка з апошняга месца работы.
8. Прыёмныя іспыты праводзяцца ў тэхнікуме з 10 лістапада па наступных прадметах: беларуская мова, руская мова, матэматыка, геаграфія, Канстытуцыя СССР і БССР.
Іспыты па матэматыцы і мовах праводзяцца вусныя і пісьмовыя.
9. З вытрымаўшых іспыты па ўсіх прадметах у першую чаргу залічаюцца асобы, якія атрымалі найбольш высокія ацэнкі пры іншых роўных умовах. Паўторныя іспыты не дапускаюцца.
10. Залічаныя ў тэхнікум і без уважлівых прычын не прыступіўшыя да заняткаў у пачатку вучэбнага года — з ліку навучаючыхся выключаюцца.
11. Скаргі на рашэнні мандатнай камісіі могуць падавацца ў ЦК КП(б)Б толькі праз дырэктара тэхнікума.
12. Залічаныя ў тэхнікум пры яўцы на заняткі павінны мець пры сабе пашпарт, ваенскі білет, талон аб знятці з партыйнага або комсамольскага ўчоту на Сталінскі горрайком КП(б)Б і ЛКСМВ г. Мінска, а таксама падушку, коўдру і дзве змены пасцельнай бялізны (наваліку, простыні).
13. Жылой плошчы сем'ям студэнтаў тэхнікум не прадастаўляе. За імі захоўваецца жылая плошча па месцу ранейшай работы паступаючага на ўвесь перыяд вучобы.
14. Расходы, звязаныя з паездкай на іспыты і па выкліку мандатнай камісіі, — за кошт установы — па месцу работы.
15. Пачатак заняткаў—1 студзеня 1940 года.
16. Усе дакументы накіроўваць заказным пісьмом па адрасу: гор. Мінск, вуліца Карла Маркса, дом № 34-а. Тэлефон № 21-790.
ДЫРЭКЦЫЯ ТЭХНІКУМА.

ДА ВЕДАМА ГРАМАДЗЯН, УСТАНОЎ І МАЙСТЭРНЯЎ!
ТОЛЬКІ Ў МАГАЗІНЕ № 53
МІНГОРПРАМГАНДЛЯ
(СОВЕЦКАЯ, 78)
ЁСЦЬ НАСТУПНЫЯ ЧАСТКІ
ДА ПАТЭФОНАЎ
БАРАВАНЫ, ШПІНДЭЛІ, ШТЫФТЫ ШПІНДЭЛЬНЫЯ, ВІЛКІ АЎТАМАТЫЧНЫЯ, ШЧОКІ, СТАНІНЫ, ПЛАСПІНКІ ДА АЎТАМАТА, ПЛАНКІ ДА АЎТАМАТА, ПЕТЛІ ДА ЯШЧЫКАЎ, РУЧКІ ЗАВАДНЫЯ, РУЧКІ-РУКАЯТКІ, ШАЙБЫ, УТУЛКІ, ГАЙКІ КРУГЛЫЯ, ПРУЖЫНКІ, ПРУЖЫННЫЯ ПРАКЛАДКІ, РУПАРЫ ДА ЯШЧЫКАЎ, ВІНТЫ ЗВЫЧАЙНЫЯ, ВІНТЫ АРМАТУРНЫЯ, ВАЛІКІ АСТАНОЎКІ, ВУГОЛЬНІКІ НІКЕЛІРАВАНЫЯ, ЗАКЛЁПКІ ЗВЫЧАЙНЫЯ, ЗАКЛЁПКІ ПЛОСКІЯ, УТУЛКІ ТОНАРМАМ, ШАЙБЫ РАЗРЭЗНЫЯ, ШАЙБЫ ЗВЫЧАЙНЫЯ, ЗАКЛЁПКІ З ВІНТАМІ, РЭГУЛЯТАРЫ СКОРАСЦІ, НОЖКІ МЕТАЛІЧНЫЯ, НОЖКІ ГУМАВЫЯ, БОЛЦІКІ, ГАЙКІ МАЛЕНЬКІЯ, СКРЫНКІ ПАТЭФОННЫЯ, ДОКІ З АЎТАСТОПАМ.
ПРОДАЖ ПРАВОДЗІЦЦА ЗА НАЯЎНЫ РАЗЛІК І ПА ПЕРАЛІЧЭННЯХ.
МАГАЗІН АДКРЫТ з 10 гадзін раніцы да 6 г. 45 м. вечара.
МІНГОРПРАМГАНДАЛЬ.

БЕЛАРУСКАЙ БАЗЕ «ОПТМЕТИЗ»
патрабуюцца
на пастаянную работу
СТ. БУХГАЛТАРЫ, БУХГАЛТАРЫ І ФАКТУРЫСТЫ.
Даведацца: Дом урада, цокальны паверх, пакой № 37.

БЕЛСОЎГАССНАБУ
патрабуюцца
РАБОТНІКІ ПАЖАРНА-ВАРТАВОЙ АХОВЫ.
Звяртацца ў Дом урада, пакой № 808. Тэлефон 25-740.

Уп. Галоўлітбела № Р—1492. Мінск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49. К., М., Ш.